# БЕЛАРУСКІ
# Й
# БЕЛАРУСАВЕДНЫ
# ДРУК НА ЗАХАДЗЕ

ЗОРА Й ВІТАЎТ КІПЕЛІ

БЕЛАРУСКІ Й БЕЛАРУСАВЕДНЫ ДРУК НА ЗАХАДЗЕ

# BELARUSIAN
# and
# BELARUS-RELATED
# PUBLISHING
# IN THE WEST

## MONOGRAPHIC PUBLICATIONS

BIBLIOGRAPHY

Compiled by
ZORA & VITAŬT KIPEL

BELARUSIAN INSTITUTE OF ARTS AND SCIENCES, Inc.
NEW YORK – 2003 – MIENSK

# БЕЛАРУСКІ
# Й
# БЕЛАРУСАВЕДНЫ
# ДРУК
# НА ЗАХАДЗЕ

## АСОБНЫЯ ВЫДАНЬНІ

БІБЛІЯГРАФІЯ

Складальнікі
Зора й Вітаўт КІПЕЛІ

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАВУКІ й МАСТАЦТВА
НЬЮ ЁРК – 2003 – МЕНСК

**Edited by LIAVON YUREVICH**
**Prepared for publishing by ŹMICIER SAŬKA**

**Рэдактар ЛЯВОН ЮРЭВІЧ**
**Падрыхтаваў да друку ЗЬМІЦЕР САЎКА**

Над кнігаю таксама працавалі

*ІЛОНА ЎРБАНОВІЧ-САЎКА — стыльрэдактура*
*НАСТАСЬСЯ МАЦЯШ — карэктура*

**Belarusian Institute of Arts and Sciences**
**Bibliographic series, No. 6.**

Library of Congress Control Number 00 093473

© БІНІМ, Вітаўт Кіпель, Зора Кіпель, 2003.

# IN MEMORIAM

Калі ў сьнежні 2002 году Зора й Вітаўт Кіпелі перадалі мне для падрыхтоўкі да друку аўтарскі варыянт кнігі, ніхто ня мог прадбачыць, што для аднаго з суаўтараў гэтага выданьня яно акажацца пасьмяротным.

Ужо праз тыдзень пасьля сьмерці спн. Зоры др. Вітаўт у тэлефоннай размове са мною сказаў, узгадваючы той чорны дзень: «Зьміцер, я адправіў табе карэктуру а першай гадзіне дня, а ўжо а чацьвертай трыццаць Зора адышла – нібы ведала, што ўсё нармальна, можна быць спакойнаю, – справа робіцца».

Складаньне бібліяграфіі пачалося больш за поўстагодзьдзя таму ў выніку запачаткаваньня збору беларускіх друкаў на Захадзе. Таму кнігу гэтую можна назваць працаю жыцьця ейных складальнікаў. На жаль, лёс не дазволіў спн. Зоры дачакацца выхаду кнігі, якая, разам зь дзясяткамі Ейных іншых публікацыяў, застанецца *помнікам* Ёй — УЗОРАМ ВЫСОКАГА СЛУЖЭНЬНЯ БЕЛАРУСІ. Застануцца таксама шчырыя ўспаміны мноства людзей, што ведалі Яе асабіста, і тых, хто быў знаёмы зь Ёю толькі па друку ці зь ліставаньня. Зорын вялізарны навуковы й духовы набытак будзе з часам асэнсаваны й ацэнены ды станецца вартаснаю часткаю скарбніцы нацыянальнае культуры.

*Зьміцер* САЎКА

# CONTENTS

*EDWARD KASINEC.* Belarusica Outside Belarus (ix–xiii)

*ZORA & VITAUT KIPEL.* From Compilers (xv–xxii)

CATALOG OF PUBLICATIONS (1–552)

NAME INDEX (553–582)

BIAS SERIES PUBLICATIONS (583–584)

# ЗЬМЕСТ

*Эдўард КАЗІНЕЦ*. Беларусіка па-за межамі Беларусі (ix – xiii)

*Зора й Вітаўт КІПЕЛІ*. Ад складальнікаў (xv – xxii)

Каталёг выданьняў (1 – 552)

Іменны паказьнік (553 – 582)

Сэрыйныя выданьні БІНіМу (583 – 584)

***Складальнікі выказваюць глыбокую падзяку тым, хто дапамагаў у зьбіраньні матар'ялаў для гэтае працы***

Мітрапаліту Мікалаю
айцу Аляксандру Надсону
сп. Уладзімеру Арлову
сп. Міхасю Белямуку
спн. Людвіцы Бяленіс
сп. Вользе Грыцук
сп. Антону Даніловічу
сп. Браніславу Даніловічу
сп. Нікодыму Жызьнеўскаму
спн. Ганьне Запартыцы
др. Янку Запрудніку
сп. Віталю Кажану
спн. Раісе Казючыц
сп. Міколу Латушкіну
сп. Юрасю Лаўрыку
сп. Уладзімеру Ляхоўскаму
сп. Шымону Мадорскаму
др. Адаму Мальдзісу
сп. Васілю Мельяновічу
спв. Лёлі й Янку Міхалюком
сп. Алесю Міцкевічу
сп. Міхасю Наўмовічу
спн. Ірэне Пануцэвіч
спв. Валянціне й Міхасю Пашкевічам
спн. Людміле Рабок
спв. Веры й Вітаўту Рамуком
сп. Міхасю Сеньку
сп. Алексу Сільвановічу
спв. Івонцы й Янку Сурвіллам
др. Юраму Туронку
сп. Антону Шукелойцю
сп. Сяргею Шупу
сп. Лявону Шыманцу

# BELARUSICA OUTSIDE BELARUS
## Catalog and Bibliography

EDWARD KASINEC
*New York Public Library*
*Slavic and Baltic Division*

The century past has been notable for the emigration of hundreds of thousands of intellectuals from the lands of Central and Eastern Europe and the former Soviet Union. Many of those intellectuals who emigrated were justifiably angry at the regimes that had repressed and often murdered their relatives. They were anxious both to excoriate these tyrannies and document the *res gestae* of their compatriots in regions distant from the homelands, including Western Europe, the Americas, and even Australia. The first bibliographical guides to the literature of the Slavic, Baltic, East European and Eurasian emigrations were published immediately after World War I. Their publication continued with unabated intensity through the interwar period, during the Second World War and its aftermath, and, especially, since the implosion of the Soviet Union. In recent years the bibliography of the Slavic, East European and Eurasian emigrations has become a cottage industry and literally dozens of bibliographical guides have appeared documenting the publishing histories of dozens of these groups outside their homelands.

In this respect the achievements of the Kipels—Zora and Vitaut—and of their remarkable family and colleagues—fall into a

pattern that is recognizable to colleagues concerned with Slavic and East European book culture. Their work reminds us of the important contributions to the émigré book culture of Ukrainians by Ivan Luckiw, Lyubomyr Wynar, Bohdan Krawciw and Bohdan Yasinsky; of Carpatho-Rusyn culture by Paul R. Magocsi; of Russian by Mikhail Schatoff; of Polish by Jan Kowalik; of Czech and Slovak by Vojtech Duben; of Bulgarian by George I. Paprikoff; of Lithuanian by A. Kantautas; and of Latvian by Benjamins Jegers[1]. There are, how-

[1] See, for example: L. Wynar. *Guide to the American Ethnic Press: Slavic and East European Newspapers and Periodicals* (Kent, Ohio, 1986); P. R. Magocsi. *Carpatho-Rusyn Studies: An Annotated Bibliography* (New York, 1988–); J. Kowalik. *Bibliografia czasopism polskich wydanych poza granicami Kraju od września 1939 roku* (Lublin, 1976); V. N. Duben. *Czech and Slovak Periodical Press Outside Czechoslovakia as of 1964* (New York, 1964); L. Seflova. *Bibliografie literatury vydane českymi a slovenskymi autory v zahranici, 1948–1972 (s dodatkem do srpna 1978)* (Köln–Paris, 1978), and her *Knihy ceskych a slovenskch autoru vydane v zahranici v letech 1948–1978, exil: bibliografie* (Brno, 1993); J. Gruntorad. *Katalog knih ceskeho exilu 1948–1994: Libri prohibiti* (Praha, 1995); G. I. Paprikoff. *Works of Bulgarian Emigrants: An Annotated Bibliography: Books, Booklets, Dissertations* (Chicago, 1985); A. Kantautas. *A Lithuanian Bibliography; A Check-list of Books and Articles Held by the Major Libraries of Canada and the United States* (Edmondton, 1975); P. Gaučys. *A Bibliography of the Lithuanian Press Outside Lithuania, 1970–1974* (Chicago, 1977); E. Koks. *A Bibliography of Estonian Art and Artists Outside Estonia* (Stockholm, 1984); M. Schatoff. *Half a Century of Russian Serials, 1917–1968: Cumulative Index of Serials Published Outside the USSR* (New York, 1970–1972); Л. Фостер. *Библиография русской зарубежной литературы, 1918–1968* (Boston, 1970); T. Ossorguine–Bakounine and A. Volkoff. *L'Emigration russe en Europe; catalogue collectif des periodiques en langue russe* (Paris, 1976–1977); D. Arans. *How We Lost the Civil War: Bibliography of Russian Emigre Memoirs on the Russian Revolution, 1917–1921* (Newtonville, Mass., 1988); Г. Толстых. *Русское зарубежье, 1917–1991: Каталог изданий из фонда библиотеки-архива* (Москва, 1992–); Е. Алексеева. *Сводный каталог русских зарубежных периодических и продолжающихся изданий в библиотеках Санкт-Петербурга, 1917–1995 гг.* (Санкт-Петербург, 1996); B. Jegers. *Latviešu trimdas izdevumu bibliografija, [1940–1991] = Bibliography of Latvian Publications Published Outside Latvia* (Stockholm, 1968–1972; 1977; 1988; Riga, 1996) and *Latviešu trimdas laikraksti = Latvian Exile Periodicals, 1944–1952* (Münster, 1996); Yu. Boshyk. *Publications by Ukrainian «Displaced Persons» and Political Refugees, 1945–1954 in the John Luczkiw Collection, Thomas Fisher Rare Book Library, University of Toronto: a Bibliography* (Edmonton, 1988); П. Зленко. *Бібліографічний покажчик наукових праць української еміграції, 1920–1931* (Edmonton, 1990); М. Бойко. *Бібліографія української*

ever, nuances that deserve mention. Zora and Vitaut are special people. They have devoted a lifetime to the collection, preservation and proseletization of resources relating to Belarusian culture in the broadest sense of this term. Since their student days in Belgium, they have actively participated in the lives of the Belarusian diaspora and have devoted time and treasure to the preservation of their understanding of the Belarusian cultural patrimony. While one can argue about certain specifics of their expansive worldview, few could dispute their devotion and stoic dedication to the preservation of the culture of their generation and their forebears.

The catalog and bibliographical guide to Belarusian émigré and other publications is proof of their zeal and devotion. The bibliographical guide contains upwards of 5,000 titles, the majority of which (90%) are now accessible to readers in the Slavic and Baltic Division of The New York Public Library. The collection has been housed in 168 archival boxes under the Belarusian classmark of *QM 99-5211 and 5212. Those items in the collections of the NYPL are indicated in the catalog with an asterisk. These books, serials, ephemera and graphics donated in 1999 add to a historical collection which now takes on the nature of a national and international resource for the study of Belarusian culture, both on its historical territories and abroad. It is fitting and appropriate that the NYPL includes this publication as the fourth volume in its ongoing Russian, East European and Eurasian Resource Series, published and distributed on behalf of the Library by Norman Ross Publishing.

The Kipels have gone against the current by donating their émigré Belarusica to an American library, not to one in Belarus. (In the last decade, other collectors of émigré Slavica and Baltica have often donated their libraries to collections in the homelands). In addition,

---

*бібліографії періоду державности і діяспоры, 1917–1980 = Bibliography of Ukrainian Bibliography of the State Period and Diaspora* (Bloomington, 1989); D. Buchynskyj. *Bibliografia ucraniana, 1945–1961* (Edmonton, 1996); О. Федотова. *Українська літературознавча бібліографія за рубежем у 20–30-х рр. XX ст.* (Київ, 1997); І. Винниченко. *Українське зарубіжжя: Бібліографічний покажчик литератури: 1900 – грудень 1999 р.* (Київ, 1999); G. Prpic. *The Croatian Publications Abroad After 1939; A Bibliography* (Cleveland, 1969) and his *Hrvatske knjige i knjizice u iseljenistvu = Croatian Books and Booklets Written in Exile* (Cleveland, 1973); A. Krizanova. *Osobnosti slovenskej exilovej literatury, 1945–1990* (Martin, 1991).

the Kipels have reaffirmed their abiding faith and trust in their native culture by initiating an endowment for the further development and preservation of the Belarusian collections of the NYPL. One should hope that others would emulate their good example. In addition, they have chosen to donate more than 40 copies of this bibliography to collections in Belarus, Eastern Europe and Eurasia. This list is also an important guide to notable cultural institutions in present-day Belarus.

This is not the place to discuss in detail either the methodology of compilation or criteria of selection for this bibliography. One may disagree with the compilers' statement that they included publications «of a Belarusian point of view» (p. xviii), or indeed their inclusion of publications of the *late 19th – early 20th* century in their repertoire. The work remains an important contribution to the documentation on this in many ways critical ethnic and political community.

While the Belarusian vernacular collection of the NYPL are small in an absolute sense, constituting no more than 9,000 units, its is nevertheless an international resource, closely related to the other internationally-significant collections of the NYPL – namely our Russian, Polish, Ukrainian, Lithuanian, and Latvian holdings. The Belarusica collections of the Library are especially dear to the tens of thousands of New Yorkers of Jewish descent, many of whose ancestors emigrated to New York from the pale of settlement located in the «South-Western territories of the former Russian Empire.» So too, this catalog-bibliography has significance for a variety of constituencies and special interests. The alphabetical name index (p. 553–582) will add more than a thousand names to the prosopography of those who in some way were involved with writing on Belarus in emigration. The titles in the bibliography – many of them described *de visu* – are in themselves an important documentation on the history of Slavic and East European publishing and printing outside the homelands and their contents an important source for the linguists, historians, sociologists of religion, and art historians.

The Kipel Collection of books, serials and ephemera has been long in the making – more than thirty years – and many have taken part in the processing of the collection upon its coming to the NYPL. It is my pleasure to thank Robert H. Davis and Hee Gwone Yoo, Librarians of the Slavic and Baltic Division as well as staff members Robinson Gomez, Olena Mokrytska, and Tatiana Salman for their

assistance in both the processing of the Kipel donation, and in the preparation of this catalog-guide.

Because of the understandable fragility and rarity of much of the Slavic and Baltic collections, they are not available for inter-library loan; however scans, film, photocopies and digitized images are available by writing to the Photographic Services of the NYPL:

**476 5$^{th}$ Av., Rm. 68, New York, NY 10018-2788**
**photoservices@nypl.org**

# АД СКЛАДАЛЬНІКАЎ

Эміграцыйны друк – гэта мікракосмас беларускага дзяржаўніка, незалежніка, прадпрыемцы ў вялікім рэчышчы штодзённага жыцьця вольнага чалавецтва. Беларускі друк на эміграцыі – гэта адначасна й тая Беларусь, якую дыяспара рэпрэзэнтавала й якою ганарылася ў доўгагадовым сужыцьці зь іншымі дзяржавамі й народамі.

Каб ня толькі захаваць, але і ўвесьці ў навуковы й культурны зварот даробак колькіх пакаленьняў беларускіх творцаў і выдаўцоў, каб зафіксаваць унікальную інфармацыю, што засталася адно ў памяці сьведкаў і ўдзельнікаў выдавецкага працэсу, – з гэтых меркаваньняў і паўстала думка стварыць бібліяграфічны даведнік «Беларускі друк на Захадзе».

Складальнікі Бібліяграфіі – сучасьнікі й суб'екты пары найбольшага разьвіцьця друку на эміграцыі (1940–90-я гг.) – імкнуліся зарэгістраваць усё, што ўважалі істотным як для беларускага руху, культуры, гэтак і з гледзішча бібліяграфічнага. У значнай ступені друк эміграцыі – адлюстраваньне нацыянальнае думкі, беларускіх памкненьняў і спадзяваньняў.

## З гісторыі беларускага друку на Захадзе

У гістарычна-культурным разьвіцьці беларускай нацыі сталася так, што беларускае кнігадрукаваньне пачалося не на Бацькаўшчыне. Доктар Францішак Скарына пераклаў і выдрукаваў Біблію ў Празе ў 1517 г. – менавіта гэтая падзея ўважаецца за пачатак беларускага кнігадруку.

Сьледам за Скарынам і іншыя ліцьвіны-беларусы друкавалі кнігі ў Заходняй Эўропе. Гэтак, беларускі пераклад ведамае па-

лемічнае кнігі Марка Антонія зьявіўся на сьвет у Франкфурце (1616)[2]. Казімер Семяновіч надрукаваў сваю працу «Artis Magnae Artilleriae» («Вялікае мастацтва артылерыі») на лаціне – у Амстэрдаме (1650), у францускай мове – у Парыжы (1651), панямецку ў Франкфурце (1676), па-ангельску ў Лёндане (1729)[3]. У Заходняй Эўропе друкаваў свае кнігі й Гальляш Капіевіч-Капіеўскі[4].

Названыя выданьні – гэта кнігі старажытнага пэрыяду беларускага кнігадруку. Але таксама ведама, што й новы пэрыяд пачаўся не на Беларусі, а навонках яе.

Аляксандар Рыпінскі пачаў публікаваць свае творы ў Парыжы (1840). Верш Паўлюка Багрыма «Заграй, заграй, хлопча малы» быў выдрукаваны ў Лёндане (1854). «Гутарка старога дзеда» зьявілася ў Парыжы ў 1862 г., а крыху пазьней, на пачатку XX ст., у Лёндане пачалі друкавацца першыя палітычныя ўлёткі ў беларускай мове. Па-за Беларусьсю пачаў выдаваць свае творы й Францішак Багушэвіч. Нью-Ёрская Публічная Бібліятэка мае Багушэвічаў «Smyk biełaruski» (Poznań, 1894), а таксама ўлёткі, якія выходзілі ў Лёндане. Раньнія беларускія выданьні друкаваліся таксама ў Цюрыху, Жэнэве, Львове, Кракаве ды Пецярбургу.

Гэткім чынам можна сьцьвердзіць, што й старажытны (у Сярэднявеччы), і новы (з XIX ст.) пэрыяды беларускага друку пачыналіся па-за Беларусьсю. Больш за тое – беларускі друк у замежжы ніколі не прыпыняўся, наадварот, пачынаючы зь першае чвэрці XX ст. беларускае кнігадрукаваньне й выданьне пэрыёдыкі з Заходняе Эўропы пашырылася на амэрыканскі кантынэнт, а з паловы таго ж стагодзьдзя – і на аўстралійскі.

Складальнікі гэтае бібліяграфіі ня ставілі сабе за мэту зарэгістраваць стары беларускі друк зь межамі Бацькаўшчыны (зрэшты, прыкладам, тыя ж Скарынавы выданьні добра апісаныя ў іншых бібліяграфічных працах). Асноўнаю мэтаю было ўлічыць новы беларускі друк па-за Беларусьсю, які існуе вось ужо больш за 150 гадоў і, на вялікі жаль, дагэтуль сыстэматычна не рэгістраваўся.

---

[2] Кніга Беларусі. Мінск, 1986, с. 94–95, №94б.

[3] Нью-Ёрская Публічная Бібліятэка мае лацінскае, нямецкае й ангельскае выданьні кнігі.

[4] Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мінск, 1995, с. 200–222.

## Ранейшыя бібліяграфіі

Спробы рэгістрацыі беларускага друку па-за межамі Беларусі, аднак, рабіліся. Гэтак, пачынаючы з 1925 г., менскі «Летапіс беларускага друку»[5] пачаў улічваць некаторыя беларускія выданьні, якія выходзілі за межамі БССР. Але ўлік такіх замежных друкаў спыніўся ў 1930-х гг.

Спроба ўліку беларускае эмігранцкае пэрыёдыкі рабілася і ў Вільні. У 1949 г. выйшла (на жаль, вельмі малым накладам) «Библиография белорусских периодических изданий: 1861–1944» ведамага бібліёграфа Владаса Абрамавічуса. У гэтую працу, укладзеную па месцы выданьня, улучаная й тая пэрыёдыка, што друкавалася ў Бэрліне, Нью Ёрку, Парыжы, Празе й Чыкага.

Паказьнік пэрыядычных выданьняў эміграцыі за 1919–1952 гг., што выйшаў у мюнхэнскім Інстытуце для Вывучэньня Гісторыі й Культуры СССР (1953), у разьдзеле «Бібліяграфія эміграцыйнай пэрыёдыкі на беларускай мове» ўтрымлівае 84 назовы.

Замежны друк спарадычна аглядаўся (і тым самым улічваўся) у беларускіх эмігранцкіх газэтах ды часапісах. Газэта «Бацькаўшчына» часам зьмяшчала агляд друку. Дарэчы тут зазначыць і некаторыя недакладнасьці й памылкі, якія надараліся ў тых публікацыях. Прыкладам, у №21–22(152–153) газэты за 31 траўня 1953 г. паведамлялася, што выйдуць наступныя кнігі: «Зборнік Узвышэнскае прозы, Зборнік Узвышэнскае паэзіі, кніга Т. Грыба», аднак кнігі гэтыя ніколі не былі выдрукаваныя. У нашай працы зазначаюцца й іншыя падобныя недакладнасьці, якія мелі месца ў эміграцыйным друку.

Парыскі часапіс «Моладзь» (№18, 1950) зрабіў добры рэестар беларускай пэрыёдыкі, што выходзіла ў 1945–1950 гг. (72 назовы). На пачатку 1970-х гг. БІНІМ пачаў сыстэматычны ўлік выданьняў дыяспары, публікуючы каталёгі друкаў, якія распаўсюджваліся Інстытутам.

Вядомыя й іншыя эміграцыйныя бібліяграфіі. Прыкладам, «Сьпісы выданьняў Грамадаўцаў» («Народным Шляхам», №2, жнівень 1952); «Сьпіс беларускіх кружэлак», выдадзены ЗБМА ў 1962 г.; «Кароткія бібліяграфіі беларускіх публікацыяў у Канадзе», падрыхтаваныя Алесем Грыцуком на пачатку 1970-х гг. Ра-

[5] Нью-Ёрская Публічная Бібліятэка мае поўны камплект «Летапісу».

біліся спробы ўлічыць эмігранцкія рукапісныя выданьні, скаўцкі й студэнцкі друк ды г. д.

Больш грунтоўнымі ды сыстэматычнымі бібліяграфічнымі рэестрамі сталіся працы Міколы Панькова. У 1948 г. быў падрыхтаваны «Паказчык Беларускіх Выгнанскіх Друкаў травень 1945 – 1 лістапада 1948 г.» («Бацькаўшчына», 12 сьнежня 1948). Пазьней, у 1952 г., Мікола Панькоў выдаў у Нью Ёрку працу, якую можна назваць першай беларускай бібліяграфіяй дыяспары, – «Паказьнік беларускіх выданьняў на чужыне за 1945–1950 гг.». У 1988 г. гэтая праца была пашыраная й дапоўненая, аднак з прычыны сьмерці аўтара засталася ў манускрыпце.

Багаты матар'ял пра беларускае кнігадрукаваньне ў часе II сусьветнае вайны, у тым ліку й па-за межамі Беларусі, сабраны Юрым Туронкам у працы «Беларуская кніга пад нямецкім кантролем (1939–1944)» (Мінск, 2002).

Найноўшае выданьне, прысьвечанае сярод іншага беларускім друкам у Празе, – «Каталог і грамадска-культурная чыннасць беларускай і расійскай эміграцыі ў Чэхаславакіі: 1921–1939» – выйшла летась у Менску.

## Абсяг працы

Пад паняткам *беларускі друк на Захадзе* разумеецца друкаваная прадукцыя, якая стваралася беларускімі арганізацыямі, цэрквамі, установамі й асобнымі аўтарамі як у беларускай, гэтак і ў іншых мовах (найбольш у ангельскай, нямецкай, францускай). Тут таксама ўлічаныя кнігі, улёткі, падручнікі, якія ствараліся або друкаваліся небеларускімі ўстановамі, арганізацыямі, асобамі небеларускага паходжаньня, але якія маюць значаньне для беларускай культуры й нацыі. Прыкладам, пасланьні папы рымскага ці канстанцінопальскага патрыярха, дакумэнты Кангрэсу ЗША ці Міжнароднае Лігі Правоў Чалавека, што мелі дачыненьне да Беларусі.

Улучаныя ў Бібліяграфію таксама працы аўтараў-беларусаў на тэмы небеларускія, калі ў тых працах выказваліся беларускія пагляды. Зарэгістраваныя й працы аўтараў-беларусаў, перакладзеныя ў заходнія мовы, а таксама падручнікі, выдрукаваныя ў Бэрліне на замову ўраду БССР. Адзначаюцца й перавыданьні эміграцыйных аўтараў на Бацькаўшчыне. Улічаныя й некато-

рыя друкі Сталае Місіі БССР у ААН ды Прадстаўніцтва БССР у ЮНЭСКО ў Парыжы, што не былі зарэгістраваныя «Летапісам друку БССР».

Складальнікі Бібліяграфіі, абапіраючыся на досьвед трыццацігадовае працы ў Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэцы, імкнуліся зарэгістраваць як мага больш беларусаведнага друкаванага матар'ялу, які амаль не засьведчаны іншымі бібліяграфіямі.

## Геаграфічныя й храналягічныя рамкі

Бібліяграфія ахоплівае беларускія друкі Заходняй Эўропы, а менавіта: Брытаніі, Бэльгіі, Гішпаніі, Даніі, Італіі, Нямеччыны, Францыі, Швайцарыі, Швэцыі, а таксама Паўночнай і Паўднёвай Амэрыкаў (Аргентыны, ЗША, Канады) ды Аўстраліі. Апроч таго, у бібліяграфію трапілі некалькі выданьняў з Вугоршчыны, Ізраілю (у заходнеэўрапейскіх мовах), Польшчы, Расеі, Сэрбіі, Чэхіі.

Асобна трэба адзначыць факт улучэньня тых выданьняў беларускіх эміграцыйных аўтараў і дасьледнікаў, што выйшлі ў Беларусі, аднак былі створаныя на Захадзе. Калі гэта перавыданьне (пераклад) кнігі, што перш зьявілася на Захадзе, то адпаведнае выданьне, надрукаванае ў Беларусі, згадваецца ў анатацыі да заходняга выданьня. Калі ж такая кніга ня мае «заходняга» адпаведніка, то яна падаецца самастойнаю пазыцыяй.

Зарэгістраваныя друкі зь першае паловы XIX ст. да 2003 г.

## Профіль бібліяграфіі

Бібліяграфія «Беларускі друк на Захадзе» складаецца зь дзьвюх частак. Першая частка («Пэрыядычныя выданьні») выходзіць у сэрыйным выданьні Нью-Ёрскае Публічнае Бібліятэкі «Russian, East European and Eurasian Resource Series» (No.4) і ўлучае беларускамоўныя часапісы, газэты, бюлетэні, абежнікі, цыркуляры, друкаваныя як выдавецтвамі ды арганізацыямі, гэтак і прыватнымі асобамі. Зарэгістраваныя ў першай частцы й іншамоўныя пэрыёдыкі, якія выдаваліся (рэдагаваліся) беларусамі, а гэтаксама іншамоўныя пэрыядычныя друкі, калі беларускія арганізацыі былі іх сувыдаўцамі.

У другой частцы Бібліяграфіі, якою й зьяўляецца гэты том, фіксуюцца асобныя выданьні, разьмешчаныя храналягічна, паводле гадоў выданьня, і ў альфабэтным парадку: спачатку кірылічны, потым лацінскі.

Улучаныя: кнігі, брашуры; адбіткі разьдзелаў кнігаў (найчасьцей у асобных пераплётах); адбіткі брашурна-манаграфічнага профілю з часапісаў; дысэртацыі; манаграфіі з сэрыйных выданьняў; аднаразовыя камунікаты (улучна з прэсавымі); улёткі, адозвы; каталёгі; дакумэнты (пашпарты, пасьведчаньні); статуты, праграмы партыяў; канцэртныя праграмкі (калі ў іх улучаная інфармацыя пра Беларусь); карты; плякаты; паштоўкі – усяго 4 180 пазыцыяў.

**Сэрыйныя выданьні**

Беларускі друк дыяспары лічыць дзясяткі сэрыяў, нумараваных і ненумараваных. У Бібліяграфіі сэрыйныя выданьні, пераважна кнігі, рэгістраваліся паасобку з указаньнем сэрыяў (у круглых дужках, пасьля выдавецкіх зьвестак). Найбуйнейшыя сэрыі: «Замежная Беларусь» (Прага, 1926); «Народная бібліятэка/бібліятэчка» (Бэрлін, 1943–1945); «Бібліятэка Каліноўцаў» (Бэрлін, 1944); «Бібліятэка сучаснасьці»; «Скаўцкая бібліятэка»; «Бібліятэка беларускіх гаспадарнікаў на Чужыне»; «Беларуская рэлігійная бібліятэчка» (Заходняя Нямеччына, 1945–1949); «Бібліятэка Беларускага Вызвольнага Фронту» (Аўстралія, другая палова 1950-х); «Бібліятэка Беларускай Думкі» (ЗША, 1960-я); «Выбраныя дыялёгі» (ЗША, 1970–80-я). БІНІМ запачаткаваў некалькі сэрыяў, якія працягваюцца й сёньня: (гл. с. 583–584).

**Календары**

Сучасьнікі прыгадваюць, што беларускія студэнты ў Празе ў міжваенны час мелі свой нацыянальны рукапісны каляндар, аднак складальнікам Бібліяграфіі адшукаць яго не ўдалося. Спрабаваў зрабіць беларускі нацыянальны каляндар Язэп Варонка ў Чыкага, але задуманага не ажыцьцявіў: толькі дапоўніў «Русский народный календарь» (1928) беларускімі элемэнтамі.

Беларускія календары-кнігі на эміграцыі рэгулярна пачалі выдавацца ў Аргентыне ў 1940 г.

Па II сусьветнай вайне календары выдавалі беларускія арганізацыі, мастацкія суполкі, газэты, прадпрымальнікі. Найбольш

календароў выходзіла намаганьнямі царкоўных структураў – прыходаў, епархіяў, брацтваў і сястрыцтваў. Як звычай, у беларускіх календарох пазначаліся нацыянальныя й рэлігійныя (праваслаўныя ды каталіцкія) сьвяты, падаваліся тэлефоны беларускіх арганізацыяў, а часам і інфармацыя пра Беларусь.

**Каталёгі**

Рэгістраваліся каталёгі розных выставаў, у тым ліку й асобных мастакоў, кніжна-бібліятэчнае дзейнасьці, гандлёвых прадпрыемстваў і г. д. Складальнікі Бібліяграфіі імкнуліся ўлічыць па магчымасьці ўсё, што зьяўлялася, бо гэты від друкаванае прадукцыі параўнальна новы для дыяспары.

**Дысэртацыі**

Рабіліся намаганьні ахапіць беларусаведныя дысэртацыі магістарскага (кандыдацкага) і доктарскага ўзроўняў. Да месца тут будзе зазначыць, што ў Бібліяграфію траплілі студэнцкія й вучнёўскія працы, калі яны распаўсюджваліся сярод шырэйшага грамадзтва.

**Паштоўкі**

Беларускія паштоўкі на эміграцыі пачалі друкавацца ды распаўсюджвацца з пачатку 1920-х гг., найбольш коламі БНР, а пазьней добры пачын перанялі мастакі, розныя выдавецтвы, арганізацыі, найчасьцей моладзевыя. Паштоўкі друкаваліся вялікімі накладамі. Прыкладам, арганізацыя моладзі ў Кліўлэндзе ў 1950–60-х гг. выдала каля 50 відаў паштовак агульным накладам каля 40 000. БІНІМ выдаў паштоўку, прысьвечаную 100-м угодкам М. Багдановіча, накладам 3 000. Паштоўка Памятнага Крыжа ў Канадзе была выдрукаваная накладам 5 000; угодкавая паштоўка БНР (1918–1988) – накладам 3 000. Найбольшым, бадай, накладам (10 000) выдала беларускую паштоўку БНР у 1919 г.

У Бібліяграфіі зробленая спроба зарэгістраваць першае выданьне кожнай паштоўкі, а перадрукі ўлічваліся не заўсёды.

**Маркі**

Складальнікі імкнуліся зарэгістраваць усе беларускія паштовыя маркі, выдадзеныя па-за Беларусьсю. Часам маркі гэтыя, наклееныя на канвэрты, штэмпэляваліся паштовымі ведамствамі.

У часе паштовага страйку ў Вялікабрытаніі ў 1971 г. беларускія маркі нават прызнаваліся ангельскім паштовым ведамствам («Беларус», №167, 1971).

**Канвэрты**

Від гэтае прадукцыі таксама шырака распаўсюджаны на эміграцыі. У Бібліяграфіі ўлічаныя канвэрты, прысьвечаныя беларускім гістарычным падзеям, угодкам і юбілеям арганізацыяў і асобаў.

**Іншыя друкі**

У Бібліяграфіі зафіксаваныя рэлігійныя друкі, публікаткі з малітвамі, нотныя лісткі, іконкі; налепкі з нацыянальнымі сымбалямі; білеты; рэклямныя ўлёткі; падстаўкі пад келіхі; плякаты; пахавальныя карткі-нэкралёгі ды інш.

## Замежная беларусіка ў Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэцы

Акрамя ўкладаньня Бібліяграфіі, вялося сыстэматычнае зьбіраньне ўсіх выданьняў дыяспары. Сабраная Калекцыя[1], што ўключае амаль 90% усяго ўлічанага ў Бібліяграфіі, была перададзеная Славянскаму Аддзелу Нью-Ёрскае Публічнае Бібліятэкі. Калекцыя закаталягаваная пад шыфрамі *QM 99-5211 і *QM 99-5212, а Бібліяграфія зьяўляецца адпаведна каталёгам Калекцыі ды далучаная да галоўнага каталёгу Славянска-Балцкага Аддзелу Нью-Ёрскае Публічнае Бібліятэкі пад шыфрам *R-Slav. Div. 75-106. Надалей плянуецца зьмікрафільмаваць Калекцыю з мэтаю перахаваць збораў ды перадаць сабранае іншым бібліятэкам. Гэтая праца, як і кніга «Беларускі пэрыядычны друк на Захадзе», што выходзіць у Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэцы, будзе разасланая ўсім большым бібліятэкам Беларусі.

*Зора й Вітаўт* КІПЕЛІ

[1] Тут і далей Калекцыяй называецца збор беларускага друку на Захадзе, што перахоўваецца ў Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэцы.

# КАТАЛЁГ ВЫДАНЬНЯЎ

## XIX стагодзьдзе

1. **Кэмпэр Дайтон, П. А.**
Крэвіч – Блянкруссія. Абятніца, якую даў пан Езус бл. Марыі Маўгажаце Алякок.
Амэрыка, 1892. 1 с.
*Гл.* "Божым Шляхам", ліпень-жнівень 1972, с. 6.

2. **Про багацтво і бедносць.**
Пераклад з украінскай мовы.
Жаньева, друкарня "Работника" і "Громади", 1881. 32 с.
Каталёг "Кніга Беларусі" (Мінск, 1986, с. 247, №262) дае абшырную інфармацыю пра гэтую брашуру й адзначае, што пераклад у беларускую мову быў зроблены пад уплывам М. П. Драгаманава, а аўтарам украінскага тэксту быў Сяргей Андрэевіч Падалінскі. Аўтарытэтны разгляд гэтае публікацыі быў зроблены А. Цьвікевічам ("А. Ц-ч") і выдрукаваны: "Беларускі Сьцяг", Коўна, №4, 1922, с. 60–61.

3. **Guépin, Dom Alphonse.**
Un apôtre de l'union des eglises au XVIIe siècle, Saint Josephat.
Paris, Poitiers, 1897–1898. 2 vols.

4. **Hutarka staroho dzieda.**
Paryż, lutego 27 (15) dnia, 1862. 23 s.
Перадрук і аналіз: "Спадчына", Мінск, №5–6, 1999.

5. [**Jackowski, Ignacy**].
Powieść z czasu mojego, czyli przygody litewskie.
Londyn, 1854. [264 s.].
Апублікаваны верш П. Багрыма "Заграй, заграй, хлопча малы".

6. **Kraszewski, Jósef Ignacy.**
Wspomnienia Polesia, Wołynia i Litwy.

Paryż, 1860. 231 s. Wyd. 2.
S. 104–112: Беларускія народныя песьні са збораў Р. Зямкевіча. Характарыстыка мовы палешукоў.

7. Le **Lescoeur, R. P.**
La persecution de l'église en Lithuanie et particuliérement dans le diocése de Vilna. Traduction du polonais.
Paris, Charles Douniol et Cie, Libraires–Éditeurs, 1873. 160 p.

8. **Oginski, Michel.**
Mémoires de Michel Oginski sur la Pologne et les polonais depuis 1788 jusqu'a la fin de 1815.
Paris, chez L'Editeur, chez Ponthieu, Libraire; Genève, Barbezat et Delarue Libraires, 1826–1827. 4 vols.
Шмат матар'ялаў зь беларускае гісторыі.

9. **Rypiński, Aleksander.**
Białoruś! Kilka słów...
Paryż, w księgotłóczni J. Marylskiego, 1840. 228 s.
Агляд беларускага фальклёру.
Вывучэньне спадчыны А. Рыпінскага працягваецца: Я. Я. Янушкевіч. Замежная архіўная беларусіка. Мінск, 1998, с. 55–59.

10. **Rypiński, Aleksander.**
Do jenerała Dembińskiego...
Londyn, 1853.

11. **Rypiński, Aleksander.**
Dwoje objawień: Poemat dziejowy...
Londyn, 1857.

12. **Rypiński, Aleksander.**
Poezje.
Londyn, Związ. 1–2, 1853–1856.
У першым зборніку (związ.) надрукаваная беларуская рамантычная баляда "Нячысьцік", якая ў тым жа 1853 г. выйшла асобным выд. у Пазнані.

13. **Rypiński, Aleksander.**
Sierżant filozof: Legenda...
Londyn, 1856.

14. **Susza, Jakób.**
Der heilige Martyrer Josaphat Kuncewicz, Erzbischof von Polozk...
München, P. Zipperer, 1898. In-16.
Traduit du latin et augmente... par Joh. Looshorn.
Жыцьцё й дзейнасьць Язафата Кунцэвіча.

15. **Susza, Jacobo.**
Vita Meletii Smotritscii.
Bruxelles, 1864.

16. **Theiner, Augustin,** ed.
Vetera monumenta Poloniae et Lithuaniae gentiumque finitimarum historiam illus trantia maximum partem nondum edita ex tabulariis vaticanis depromta collecta ac serie chronologica disposita.
Romae, typis Vaticanis, 1860–1864. 4 v. fol.

17. **Zalenski, Stan.**
Les Jésuites de la Russie-Blanche, ouvrage traduit du polonais par P. Alexandre Vivier, 13 juin 1886.
Paris, Letouzey et Ané, 1886. 2 vols.
Аўтарытэтная праца пра езуітаў на Беларусі.

# XX стагодзьдзе

## Да 1918 году

18. **Богданович, М.**
Білоруське відродженне.
Відень, накладом Союза Визволення України, 1916. 30 с.

19. **Гутарка аб тым, куды мужыцкіе грошы йдуць.**
Лондын, выдавецтва Польскай партыі сацыялістычнай у Літве, Printed and published by J. Kaniowski, 1902. 16 с.
Перавыд.: Пецярбург, "Грамада", 1907.

20. **Хто праўдзівы прыяцель беднага народу?**
Лёндан, выдавецтва Польскай партыі сацыялістычнай у Літве, Printed and published by J. Kaniowski, 1903. 16 с.

21. **Як зрабіць, каб людзям стала добра на сьвеце?**
Лёндан, выдавецтва Польскай партыі сацыялістычнай у Літве, Printed and published by J. Kaniowski, 1903. 13 с.
*Гл.* Кніга Беларусі, с. 263, №412.

22. **Brandt, B.**
Geographischer Bilderatlas des polnisch-weissruthenischen Grenzgebietes, mit 100 photographischen Aufnamen...
Berlin, 1910.
Атляс здымкаў Заходняе Беларусі й польска-беларускага памежжа.

23. **Conférence des Nationalités (3e, Lausanne. 1916).**
Mémoire des representants de la Ruthénie Blanche à la 3e Conférence des Nationalités.
Lausanne, 27 juin 1916. 4 p.
Lausanne, Imp. Coopérative.
Мэморыя (дэклярацыя) прадстаўнікоў Беларусі на III канфэрэнцыі нацыяў у Швайцарыі ў чэрвені 1916 г.
Друкавана: у францускай мове 27.6.1916, у беларускай мове: Менск, выдавецтва "Вольная Беларусь", 1917, пераклад Браніслава Эпімаха-Шыпілы.

24. **Iwanowska, H.** and **H. Onslow.**
Some White Ruthenian folksongs.
Folk-lore, London, vol. 25, 1914, p. 91–109, 212–226; vol. 35, p. 64–82.
Ужываецца слова Byeloruss.
Асобны адбітак: БАЗА, 1979, раздаваўся на Беларускім Фэстывалі, а таксама рассылаўся ў бібліятэкі й дасьледнікам беларускае музыкі й фальклёру. (В. К.)
*Гл. таксама:* Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, 1979.

25. **Palisander, Heb.**
The White-Russians. A Nation driven back into the Middle Ages under Muscovite rule.
London, The Anglo-Russian, December 1904, p. 875–876.
Нямецкая вэрсія: Heb. Palisander. Das totgesagte Weissrussland. In: Ruthenische Revue, Wien, №19, Erstes Oktoberheft 1904, S. 533–538.
Кароткае апісаньне гісторыі Беларусі й шматлікія дэталі становішча Беларусі ў складзе Расейскай Імпэрыі. Аналіз уплыву беларускае культуры на польскую й расейскую.
Адзін зь першых артыкулаў у ангельскай мове пра наступствы расейскай акупацыі Беларусі. Аўтар А. Луцкевіч(?).
Асобны адбітак: БІНІМ, 1976, 1982, 1987, па 200–500 асобнікаў, рассылаўся шмат якім эцыкляпэдычным выдавецтвам, дасьледнікам беларусікі, беларускім арганізацыям. (В. К.)

26. **Struck, Hermann** and **Herbert Eulenberg.**
Skizzen aus Litauen, Weissrussland und Kurland, von Hermann Struck und Herbert Eulenberg.
Berlin, G. Stilke, 1916. 21 S., 60 plates.
Hergestellt in der Druckerei des Oberbefehlshabers Ost.

27. **Ustav tovaryshchestva Belorussov i Malorussov v Grand Rapids, Mich… (The statute of the society of Byelorussians and Ukrainians in Grand Rapids, Mich.)**
New York, Swet, 166 Ave. A., 1914. 12 p.
Статут аднае зь першых беларуска-ўкраінскіх арганізацыяў у ЗША.

28. **Wasilewski, Leon.**
Die nationallen und kulturellen Verhältnisse im sogenannten Westrussland.
Wien, "Polen", 1915. 45 S.

29. **Wasilewski, Leon.**
Die Ostprovinzen des alten Polenreiches (Litauen und Weissruthenien...).
Krakau, 1916. 364 S.

30. **Westrussland und seiner Bedeutung für die Entwicklung Mitteleuropas.**
Leipzig, Berlin, Verlag und Druck B. G. Teubner, 1917.

## 1918–1920

31. **Беларуская Вайсковая Камісія, Рэгулямінова-школьная падкамісія.**
Вайсковая Бібліятэка, службовыя рэгуляміны. Пяхота: часьць 1, фармальная муштра; часьць 2, школа бою.
Лодзь, 1920. 108 с. Выд. 2.
Пераклад з польскага.
Зазначана: дазволена да друку і ўжываньня ў беларускіх вайсковых аддзелах пісьмом M.S.W., Дэпартамэнт I...
На вокладцы пячатка: <Пагоня>, у коле надпіс: Выдавецтва Беларускай Вайсковай Камісіі.

32. **Беларуская Народная Рэспубліка.**
Мэмарандум Ураду БНР Прэзыдыюму Канфэрэнцыі Балтыцкіх Дзяржаваў у Рызе зь інфармацыяй пра БНР.
[Бэрлін–Рыга], 12 жніўня 1920. 6 с.
У беларускай, францускай і расейскай мовах.

33. **Беларуская Народная Рэспубліка.**
[Пашпарт грамадзяніна...].
Бэрлін, друкарня Язэпа Галеўскага, 1918. Рознага фармату.
Пашпартоў было выдрукавана некалькі тысячаў. Яны сустракаюцца ў розных краінах і з рознымі візамі. Прыкладам, некалькі сотняў такіх пашпартоў было выдадзена палонным беларусам на Балканах (інфармацыя: Іван Ермачэнка, Belair-Miensk, 1969 г., у часе адзначэньня 25 угодкаў II Кангрэсу). Пашпарты БНР таксама друкаваліся ў Бэрліне і ў 1919 г. У верасьні 1919 г. у Бэрліне было аддрукавана 10 000 блянкаў пашпартоў (інфармацыя: Сяргей Шупа). (В. К.)
*Гл. таксама:* "Беларускі калекцыянер", Менск, №20, люты 2000.

34. **Беларуская Народная Рэспубліка. Рада.**
[Маркі БНР, Асобны Атрад...].
[Бэрлін], люты 1920.
У філятэлістычнай літаратуры ідзе жвавая дыскусія: дзе, калі, колькі, якія наміналы былі выдадзеныя. Для зацікаўленых рэкамэндуем: “Беларускі калекцыянер”, Мінск; Архівы БНР, 1998, т. 1, 2. У калекцыі БІНІМу ёсьць “Пісулька БНР – сэкратарыят” з паштовымі маркамі БНР, пагашанымі ў Рызе 23.4.1920.

35. **Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва.**
З архіваў... 1920-х гадоў.
Нью Ёрк, 1998.
Папка з копіямі дакумэнтаў:
1. БНР, Дыпляматычная місія ў Маскве 20.8.1920.
2. Мэмарандум з Варшавы (28.5.1920) у Дзяржаўны Дэпартамэнт ЗША аб стане “Беларускага руху ў Заходняй Беларусі”.

36. **Беларусь:** [зборнік].
Бэрлін, 1919.
Пры ўдзеле Р. Абіхта. Пераклады Р. Абіхта.
*Гл.* Беларуская мова: Энцыклапедыя. Мінск, 1994, с. 8.

37. **З Роднага Краю: памятка Беларусам-палонным.**
Бэрлін, Тыпаграфія Вільгельма Гартмана, 1919. 12 с.
Ілюстрацыі. Друк – прыблізна красавік-травень 1919 г. Разглядаецца часам таксама як пэрыядычнае выданьне колаў БНР, але гэта выданьне не пэрыядычнае. Упаўнаважаны па справах ваеннапалонных місіі БНР Антон Борык у справаздачы за 5.07.1919 называе гэтую публікацыю “кніжкаю”.
*Гл.* Дзяржаўны Архіў Літвы, №582, воп. 2, спр. 42, арк. 32–37; Летапіс Беларускага Друку, Менск, 1927. Частка III, №99.

38. **Карта Беларускай Народнай Рэспублікі.**
Бэрлін, друкарня В. Гартмана, жнівень 1919. Маштаб 1:2.000.000.
Назоў у беларускай і францускай мовах.

39. **Карта Беларускай Народнай Рэспублікі = Carte de la Republique Democratique Blanche-Ruthenienne.**
[Berlin], 1920(?).
*Гл. таксама:* Архівы БНР, 1998, №1848.

40. **Мэмарандум аб становішчы ў Беларусі, пададзены 18.12.1920 у Лігу Нацый у Жэневе Дэлегацыяй Беларускай Народнай Рэспублікі.**
Жэнева, 18 сьнежня 1920. 6 с.
У беларускай, францускай і расейскай мовах.
*Гл. таксама:* Архівы БНР, 1998, №2552.

41. **Мэмарандум, пададзены 16.12.1920 у Лігу Нацый у Жэневе Дэлегацыяй Беларускай Народнай Рэспублікі ў справе захопленых Польшчай заходнебеларускіх земляў.**
[Жэнэва, сьнежань 1920]. 9 с.
У беларускай, францускай і расейскай мовах.
*Гл. таксама:* Архівы БНР, 1998, №2546.
Разам з мэмарандумам ад 16.12.1920 быў аддрукаваны на ратататары й ліст за подпісам В. Ластоўскага "Delegation de la Republique Democratique de Belarous". Monsieur le President de la Société de Nations…
Geneve, le 16 Decémbre 1920.

42. **Мэмарандум Рады Народных Міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі за 15.09.1920 Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы ў справе распачатых мірных перагавораў паміж Расеяй і Польшчай.**
Рыга(?)–Бэрлін(?), 15.09.1920.
*Гл.* Архівы БНР, 1998, №2371.
Ёсьць некалькі копіяў, адна зь іх была ў Інстытуце Ю. Пілсудзкага ў Нью Ёрку.

43. **Паштоўка з гербам і надпісам "Няхай жыве Беларуская Народная Рэспубліка".**
Бэрлін, верасень 1919. 10 000 асобнікаў.

44. **Цвикевич, А.,** др.
Беларусь: Политический очерк. Перевод с белорусского.
Берлин, Издание Чрезвычайной Дипломатической Миссии Белорусской Народной Республики, 1919. 29 с.
Перавыд.: Менск, 1990.

45. **Abicht, Rudolf.**
Péršaia stupień.
Wrocław(?), 1918(?). 16 s.
Перахоўваецца ў Нацыянальнай Бібліятэцы ў Празе (Národní knihovna Česke republiky); шыфр: Slovanske K. 91.

46. **Abicht, Rudolf, Janka Stankiewič.**
Prosty sposab stacca ŭ karotkim časie hramatnym.
[Брэслаў, 1918]. 8 s.
Зазначана: Dr. Rudolf Abicht u Breslawi i Janka Stankiewič u Wilni.
*Гл.* Беларуская мова: Энцыклапедыя, Мінск, 1994, с. 8.

47. **Brandt, B.**
Beobachtungen und Studien über die Siedlungen in Weissrussland.
Асобныя адбіткі з: "Gesellschaft für Erdkunde zu Berlin", Berlin, 1918, S. 269–292; 1919, S. 44–78.

48. **Curschmann, Fritz.**
Die Weissruthenen. Ein erwachendes slawisches Bauernvolk.
Berlin, 1918. 24 S.
Асобны адбітак з: "Deutsche Rundschau", Berlin, Band 176, 1918, S. 273–296.

49. **Dovnar-Zapolski, M.,** prof.
The basis of White Russian's State Individuality.
Paris, 1919. 22 p.
Таксама ў беларускай, францускай, польскай, нямецкай, расейскай мовах.

50. **Eckardt, Johannes.**
Die Weissrussen.
Асобны адбітак з: "Osteuropäische Zukunft", München, №15, 1918, S. 168–169.
Добры агляд беларускай дзяржаўніцкай дзейнасьці; дзейнасьць БНР.

51. **Great Britain Foreign office. Historical section.**
Russian Poland, Lithuania and White Russia.
London, 1920. 144 p. (Handbooks; No. 44.)
Агляд палітычнага стану Беларусі. Агульныя геаграфічныя зьвесткі.
P. 143–144: Bibliography.

52. **Grumbach, S.**
Brest-Litowsk.
Lausanne, Verlag Payot, 1918. 127 S.

53. **Hladki, Victor.**
Une anneé d'administration polonaise dans les gouvernement de la Russie occidentale.
Paris, 1920. 8 p. [Paris, M. Piece, 4981].
Пра вынікі дзеяньня польскіх уладаў на Беларусі.

54. **Jäger, Walter.**
Weissruthenien: Land, Bewohner, Geschichte, Volkswirtschaft, Kultur, Dichtung.
Berlin, K. Curtius, 1919. 140 S.
Выдатная манаграфія – першая такога профілю.
*Гл.* "Беларус", №449, 1997.

55. **Kutrzeba, Stan.**
Commission polonaise des travaux préparatoires a la Conference de la Paix. Droits de la Russie sur la Lithuanie et sur le Ruthénie blanche.
Paris, Imprimerie de Levé, mai 1919. 4 p.

56. **Kutrzeba, S.**
Droits de la Russie sur la Lithuanie et sur la Ruthénie-Blanche.
Paris, Levé, 1919. 12 p.
*Гл. таксама:* Kraus Reprint, Nendeln: SEEDS of Conflict, ser. 1, Lithuania, 1973.

57. **Kutrzeba, Stan.**
The Rights of Russia to Lithuania and White-Ruthenia.
Paris, Imp. Flinikowski, 1919. 12 p.
Аўтар аналізуе прэтэнзіі Расеі на Літву й Беларусь. У ангельскай і францускай мовах.

58. **[Ladnoŭ, A.].**
Мэмарыял Беларускай Дэлегацыі Нарадзе Паслоў на Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы.
Парыж, 24 лютага 1920. 1 s.

59. **[Ladnoŭ, A.].**
Дэклярацыя Беларускай Дэлегацыі на Мірнай Канфэрэнцыі ў Парыжы за 25.02.1920.
Paris, 1920. 6 s.
*Гл.* Архівы БНР, 1998, №№1896, 1897.

60. **L'avenir de la Lithuanie et de la Russie Blanche.**
Notes revues et approuvées par la Délégation des conseils nationaux polonais.
Varsovie, 1919. 8 p.
Польшча заяўляе правы на Беларусь, матывуючы свае прэтэнзіі тым, што беларускія масы цёмныя й толькі Польшча можа забясьпечыць ім будучыню.

61. **Loutckevitch, Antoine,** President of the Delegation of the White-Ruthenian Democratic Republic.
Protest against the recognition of Admiral Koltchak; Collective declaration...
Paris, July 17, 1919 = Парыж, лета 1919.
Дакумэнты ад імя БНР былі перададзеныя Канфэрэнцыі ў Парыжы, былі аддрукаваныя й асобна.

62. **[Luckevič, Anton].**
Мэмарыял аб стаўленьні беларусаў да магчымае фэдэрацыі на ўсходзе Эўропы...
Парыж, 1919. 3 s.
*Гл.* Архівы БНР, 1998, №1228; ёсьць таксама ратапрная копія.

63. **Lithuanie et Ruthénie Blanche.**
Varsovie–Paris, Imprimerie de Levé, 1919. 42 p.

Пра супольнае гістарычнае разьвіцьцё Літвы й Беларусі, агульны агляд.

64. **Lutosławski, Wincenty.**
Lithuania and White Ruthénia.
Paris, Imprimerie de Levé, 1919. 36 p., map.
Перадрук: Kraus Reprint, Nendeln. In: Seeds of Conflict Series 1, vol. on Lithuania, 1973, p. 213–247.
Палітычнае становішча й гісторыя Беларусі.

65. d'**Osnobichine, A.**
De la Baltique à la Mer Noire; Fritz Simon. Une grande ligne de navigation entre Baltique at la Mer Noire; Russie Blanche. Resolution du Congrès Blanc-Russien des gouvernements de Vilna et de Grodno les 9–10 juin 1919.
Paris, Revue Parlementaire, №35–36, 1.09.1919.
*Гл.* Архівы БНР, 1998, №1335.

66. **Petition presente par la delegation du gouvernement de la Republique Démocratique de la Ruthénie Blanche.**
Paris, Conference de la Paix, Mai 1919. 6 p.
*Подпіс:* Antoine de Loutscewitch.
Ангельская вэрсія: Grodno, 22 Jan. 1919. Машынапіс.
Падобны дакумэнт "Мэмарыял Дэлегацыі БНР...", Paris, le 4 août, 1919, перадрук: Архівы БНР, 1998, №1297.

67. **Sieben-Sprachen-Wörterbuch: Deutsch-Polnisch-Russisch-Weißruthenisch-Litauisch-Lettisch-Juddisch** / Herausgegeben im Auftrage des Oberbefehlshabers Ost.
Leipzig, Presseabteilung des Oberbefehlshabers Ost; Otto Spamer, 1918. 419 S.
Перахоўваецца ў Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэцы.

68. **Siemieński, J.,** prof.
Les Blancs-Ruthenes et la question blanche-ruthene.
Paris, 1918. 9 p.
Адбітак з: Prof. Siemieński, J. La Pologne..., Paris, 1918, p. 848–856.

69. **Vie économique de la Lithuanie et de la Ruthénie.**
Fribourg–Lausanne, Imprimeries réunies, 1919. 142 p., tables.
Encyclopédie polonaise, IV ptie du volume III. Publicatious encyclopédiques sur la Pologne.
Нарыс разьвіцьця эканомікі Беларусі.

70. **XXX [Luckievič, Anton].**
A summary glance into the history and the situation of White Russia.
Paris, 1919. 5 p.
Асобны адбітак з: "Eastern Europe", Paris, 1919, no. 2, Sept. 16,

р. 45–49.
Аўтар даводзіць, што, хоць Расея ператварыла Беларусь у калёнію, у 1918 г. была абвешчана БНР і ад імя гэтае беларускае дзяржавы праводзіцца замежная палітыка.

## Пасьля 1920 году

### 1921

71. **Беларускае Прэс-Бюро, Нью-Ёрк.**
[Інфармацыйная ўлётка].
Нью-Ёрк, чэрвень 1921. 2 с.
Ёсьць паведамленьне ў друку Заходняй Беларусі, пра гэтую ўлётку згадваў таксама М. Аблажэй.

72. **Беларуская Нацыянальна-Палітычная Нарада ў Празе-Чэскай, верасень 1921.**
Рэзалюцыі... прынятыя 28.09.1921.
Прага-Чэская, 28 верасьня 1921. 8 с. Машынапіс; 20–30 асобнікаў.
У беларускай і францускай мовах.
Падшыўка рэзалюцыяў перахоўвалася ў архіве БНР у В. Захаркі.
*Гл. таксама:* Архівы БНР, 1998, №2979.

73. **Каталёг-клішэ (1-га чэрвеня 1921 г.)**
Менск–Вільня–Бэрлін, Выдавецкае таварыства "Вызваленьне", 1921. 20 с.

74. **Станкевичъ, В.**
Судьбы народовъ Россіи: Бѣлоруссія, Украина, Литва, Латвія, Эстонія, Арменія, Грузія, Азербайджан, Финляндія, Польша.
Берлинъ, издательство И. П. Ладыжникова, 1921. 373 с.
С. 20–47: Бѣлоруссія.
Існуе асобны адбітак, 29 с. В. К. бачыў яе ў Бэрліне ў 1944 г.

75. **Тарашкевіч, Б. А.**
Беларуская граматыка для школ.
Менск–Вільня–Бэрлін, Выдавецкае таварыства "Вызваленьне", 1921. 62 с.

76. **Цьвікевіч, А.**
Адраджэньне Беларусі і Польшча.
Менск–Вільня–Бэрлін, Выдавецкае таварыства "Вызваленьне", 1921. 192 с.
Бібліяграфія.
Кніга друкавалася ў Бэрліне.

77. **Lastowski, W.**
Juga und Hramawik. Eine weissruthenische Legende.
Асобная газэтная паласа-адбітак з: “Sonntagsblatt der Kőnigsberger Hartungschen Zeitung”, №449, 25.09.1921.

78. The **Lithuanian-Polish dispute.**
Second Assembly of the League of Nations at Geneva 1921.
London, Eyre and Spottiswoode, 1921. 101 p.
Матар’ялы да гісторыі Беларусі. Статыстычныя зьвесткі.

79. **Vanlande, R.**
Avec le Général Niessel en Prusse et en Lithuanie. La Derniére Défaite Allemande.
Paris, Charles–Lavauzelle & Cie, 1921. 184 p.

## 1922

80. **Адозва. [Беларусы Злучаных Штатаў і Канады].**
Прага, 1922. 1 с.
Заклік да беларусаў ЗША й Канады закладаць свае арганізацыі й фонды.
Адозва разам зь вершам П. Крэчэўскага, прысьвечаным беларускім эмігрантам за акіянам, *гл.* Архівы БНР, 1998, №№3086, 3103. Частка адозвы была ў архіве М. Аблажэя.

81. **Беларуская Народная Рэспубліка.**
Зварот дэлегацыі БНР на Генуэскай канфэрэнцыі...
Бэрлін(?), май 1922. 2 с.

82. **Беларуская Народная Рэспубліка. Урад.**
Праект Мэмарандуму Ўраду БНР Генуэскай канфэрэнцыі...
Бэрлін(?), 1922. 5 с.

83. **Гартны, Цішка.**
Песьні працы і змаганьня (Зборнік вершаў).
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 102 с.

84. **Гартны, Цішка.**
Сокі цаліны: Раман у 3-х частках. Ч. 1. Бацькава воля.
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 157 с.

85. **Далоў ганебны рыжскі падзел!**
Бэрлін, выдавецтва “Вызваленьне”, 1922.
Паштоўка, выдадзеная коламі БНР. Надпіс: “Ніхай жыве вольная, непадзельная селянская Беларусь”.

86. **Круталевіч, А.**
Элемэнтарная альгэбра. Частка 1-я.
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 103 с.
С. 98–101: беларуска-расейскі слоўнік матэматычных тэрмінаў, каля 200 словаў.

87. **Лёсік, Я.**
Наша крыніца: Чытаньне для беларускіх школ.
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 276 с. Выд. 2, выпраўленае.

88. **Некрашэвіч, С.**
Беларускі лемантар.
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 72 с.

89. **Повстанчество в Белоруссии.**
Владивосток, “Печатное Дело”, 1922. 12 с.

90. **Тэраўскі, Ул.**
Беларускі лірнік. Сьпеўнік на чатыры галасы.
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 92 с.

91. **Цыгельман, К. А.**
Аснаўныя пачаткі арытмэтыкі. Сіст. канспэкт для паўтарэньня арытмэтыкі ў ніжэйшых і сярэдніх школах.
З 30-га расейскага выданьня пераклаў настаўнік Ю. Лістапад.
Бэрлін, выданьне Навукова-Літэрацкага Аддзелу Камісарыяту Асьветы БССР, 1922. 106 с. Выд. 2.

92. **Яремченко, О.**
Білорусь: Збірка поезії.
Берлін, 1922. 40 с.
Украінскія пераклады твораў М. Багдановіча, А. Гаруна, Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі.

93. **Republique Démocratique Bélo-Russienne (Ruthenie Blanche).**
Memoire pour la Conference des Etats a Genes.
Berlin(?), 1922. 6 p.
У францускай, ангельскай і беларускай мовах.
*Гл.* Архівы БНР, 1998, №№31, 32.

## 1923

94. **[Беларуская Народная Рэспубліка].**
À la Haute Société des Nations à Genève. [Mémoire des Représen-

tants du people Biélorusse opprimé par la Pologne].
Genève, [1923]. 5 p.
Мэмарандум пра становішча беларусаў у Польшчы. У ангельскай і французскай мовах.

95. **Крэчэўскі, Пётра.**
Адозва да сяброў Рады БНР і да ўсіх беларускіх арганізацыяў.
[Прага, 12.07.1923]. 2 с.
Выступ супраць Рыскае ўмовы.
*Гл.* Архівы БНР, 1998, №3417.

96. **Kuba.**
[Weissrussische Lieder mit Melodien und Klavierbegleitung].
[Niamieččyna], Slawentum, 1923. Bd. VI.

тэню Галоўнай Управы БАЗА №48, 1961, яна рассылалася таксама й як асобнае выданьне.

1754. **Беларуска-Амэрыканская Нацыянальная Рада ў Чыкага.**
Запросіны ўзяць удзел у чарговым зьезьдзе беларусаў ЗШП Амэрыкі й Канады...
[Парадак дня].
Чыкага, 5 жніўня 1961. 1 с.
*Подпіс:* Анатоль Новік, старшыня.

1755. **Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква.**
Упамінальная кніжка.
Кліўленд, Згуртаваньне Беларускай Моладзі ў Амэрыцы, 1961. 8 с.
*Гл. таксама:* БАПЦ. Упамінальная кніжка. Bradford, 1968.

1756. **Беларуская Праваслаўная Царква ў Юрысдыкцыі Канстантынопальскай Патрыярхіі.**
Адозва: Беларусы розных веравызнаньняў...
Саўт Рывэр, Н.Дж., 1961. 4 с.
Супраць уніятаў. Больш за 20 подпісаў беларускіх сьвятароў і грамадзкіх дзеячаў. Беларускія праваслаўныя грамады.

1757. **Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва.**
[Палесьсе].
New York, 1961. [Бп.].
У БІНІМе плянаваўся зборнік “Палесьсе”. Частка матар’ялаў друкавалася на ратапары для абмеркаваньня на зборках.
У гэтай папцы наступныя матар’ялы: Zahorny, R. Zachodniaje Paleśsie ŭ suviazi z knihaj Engelharda “Weissruthenian”; некалькі казак з Палесься.

1758. **Беларускі Каляндар на 1961 год.**
South River, N.J., друкаваў А. Даніловіч, студзень 1961.
Памесячны; назвы месяцаў у беларускай і ангельскай мовах; пазначаныя амэрыканскія дзяржаўныя й беларускія нацыянальныя й рэлігійныя сьвяты.

1759. **Беларускі Кангрэсавы Камітэт.**
Дзяржаўнаму сакратару ЗШП Амэрыкі.
Нью Ёрк, 1-га лютага 1961. 4 с.
*Подпіс:* І. Касяк, старшыня.
Мэмарандум пра палітычнае становішча ў БССР.

1760. **Беларускі Культурна-Рэлігійны Тыдзень Студыяў.**
Вялікі канцэрт.
Chicago, July 1, 1961. 3 с.
Канцэртная праграма. Кіраўнік канцэрту праф. Мікола Куліковіч.

1761. **Браты Суродзічы!**
Чыкага, Рада БАНР, 30 жніўня 1961. 1 с.
Зварот сяброў БАНР да зьезду беларусаў ЗША й Канады ў Чыкага 2–3.09.1961.

1762. **"Вагнэр ці Лефковіц".**
[Адозва].
Нью Ёрк, 6.10.1961. 1 с.
Перадвыбарчая ўлётка пра вечар з прадстаўнікамі Рэспубліканскай і Дэмакратычнай партыяў.

1763. **Дапамога беларускай моладзі ў Нямеччыне й сувязь зь ёю.**
New York, "Biełaruskaja Moładź", 15 красавіка 1961. 2 с.

1764. **Дзясяты Зьезд Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Амэрыцы.**
Праграма.
Krumville, New York, ЗБМА, 2–3 верасьня 1961. 4 с.

1765. **Езавітаў, К.**
Беларуская школа. Першая пасьля лемантара кніга для чытаньня ў беларускай асноўнай школе ў Латвіі.
ЗША, перавыданьне Злучанага Беларуска-Амэрыканскага Дапамаговага Камітэту, 1961. 155 с.
Перад тытулам укладка-зварот: "Настаўніку і бацькам улічваць карэкту..." (*подпіс:* Прот. М. Лапіцкі, Старшыня камітэту, 3.5.1961).

1766. **Жывіца, Юры.**
Адгалосьсе: Успаміны.
[Нямеччына], выдавецтва "Вехі", 1961. 20 с.
Заўвага аўтара: "Выданьне зборніка заўдзячваю А. Новіку і Я[нку] З[олаку]".
Год стварэньня 1952.

1767. **Жывіца, Юры.**
Кошык: Расказы.
Pirmasens-Windsberg, выдавецтва "Вехі", 1961. 20 с.
Зборнік прысьвечаны памяці бацькоў.

1768. **Жывіца, Юры.**
Расказы. Сшытак I.
[Нямеччына], выдавецтва "Вехі", 1961. 20 с.
21 апавяданьне.

1769. **Жывіца, Юры.**
Расказы. Сшытак II.
[Нямеччына], выдавецтва "Вехі", 1961. 20 с.
18 апавяданьняў.

1770. **Жывіца, Юры.**
Расказы. Сшытак 3.

[Нямеччына], выдавецтва “Вехі”, 1961. 20 с.
13 апавяданьняў.

1771. **Жывіца, Юры.**
У санаторнай белі.
[Нямеччына], выдавецтва “Вехі”, 1961. 20 с.
Зборнік апавяданьняў-успамінаў. 16 апавяданьняў.

1772. **За свайго беларускага епіскапа!**
Прачытай і перадай другому.
Чыкага, 15 ліпеня 1961. 2 с.
Адозва ў падтрымку епіскапа Ўладзімера Фінькоўскага.
*Подпіс:* Вернікі Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы.

1773. **Згуртаваньне Беларускай Моладзі ў Амэрыцы.**
Дзясяты гадавы зьезд 2–4 верасьня 1961.
Зварот. Праграма зьезду.
Нью Ёрк, ЗБМА, 1961. 2 с.

1774. **Зямкевіч, Ромуальд.**
Ян Баршчэўскі...
Нью Ёрк, “Веда”, 1961.
Перадрук з выд.: Вільня, 1911. 12 с.

1775. **Інфармацыйны бюлетэнь парахвіі Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку.**
Нью Ёрк, Бруклін, БАПЦ, кастрычнік 1961. 2 с.
Адмысловы бюлетэнь-паведамленьне, які інфармуе прыхаджанаў і шырокае грамадзтва пра дзейнасьць і фінансавы стан прыходу.

1776. **Інфармацыйны лісток Камітэту Абароны Беларускае Аўтакефальнае Царквы ў Кліўлендзе.**
Кліўленд, студзень 1961. 2 с.

1777. **Кавыль, Міхась.**
Цяжкія Думы: Санэты.
Саўт Рывэр, выданьне Беларуска-Амэрыканскага Дапамаговага Камітэту, 1961. 61 с.

1778. **Камітэт набыцьця беларускага цэнтру адпачынку.**
Запросіны... на сход прыняць і зацьвердзіць статут.
Нью Ёрк, 27 кастрычніка 1961. 2 с.

1779. **Каталёг кіёску Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Амэрыцы. Аддзел Нью Ёрк.**
Бруклін, 1 верасьня 1961. 7 с.
*Гл. таксама:* Byelorussian Youth Association. Новыя кнігі, 1962.
Каталёг шырака рассылаўся, і кнігі набываліся.

1780. **Крывіцкае Навуковае Таварыства Праньціша Скарыны.**
Ратуйма скарбы свайго народу.

Нашто і як зьбіраць геаграфічныя і асабовыя назовы беларускія?
[New York, 1961. 5 с.].
*Гл. таксама:* Станкевіч, Я, 1962.

1781. **Куліковіч, М.**
Калядоўшчыкі: Byelorussian Christmas Songs.
Cleveland, Byelorussian Youth Assn. in Cleveland, 1961. 17 с.
На вокладцы таксама па-беларуску: Выдавецтва Згуртаваньня Беларускай Моладзі ў Кліўлэндзе. Вокладка каляровая, зь беларускім арнамэнтам.
У варыянце выд. бяз вокладкі – назоў толькі ў ангельскай мове.
Калядкі з нотамі; гульні; прыказкі калядоўшчыкаў.
Перавыд. са зьменамі: М. Куліковіч. Калядоўшчыкі: Каляды і калядныя песьні з гульнямі. Беласток, апрацоўка Кругу Праваслаўнай Моладзі і Беларускага Аб'яднаньня студэнтаў, 1989. 17 с.

1782. **Культурна-рэлігійны тыдзень у Чыкаго.**
"Вельмі паважаны Спадар, як Вам ведама з прэсы...".
Чыкаго, 3 чэрвеня 1961. 2 с.
Абвестка.
*Подпіс:* В. Пануцэвіч.

1783. **Культурна-рэлігійны тыдзень студыяў у Чыкаго 1–5 ліпеня 1961.**
Парадак тыдня студыяў у Чыкаго 1–5 ліпеня 1961 г.
Чыкаго, чэрвень 1961. 2 с.
*Подпіс:* Выканаўчы Камітэт Тыдня Студыяў.

1784. **Культурна-рэлігійны тыдзень студыяў у Чыкаго 1–5 ліпеня 1961.**
Пастановы й Рэзалюцыі.
Чыкаго, ліпень 1961. 2 с.

1785. **Кушаль, Ф.**
Войны вялікага князя маскоўскага Івана Трэйцяга зь Вялікім Княствам Літоўскім.
Нью Ёрк, 1961. [20 с.].
Асобны адбітак з: "Бацькаўшчына", №564–565, 23 ліпеня; №566, 30 ліпеня; №567, 6 жніўня; №568, 13 жніўня 1961.

1786. **Машара, М.**
Сьмерць Кастуся Каліноўскага.
Чыкаго, выдавецтва Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў штаце Ілінойс, 1961. 18 с.

1787. **Мерляк, К.**
Ад старшыні Галоўнае Управы БАЗА.
"Справядлівасьць" рэдакцыі "Бацькаўшчына".
Нью Ёрк, 17 студзеня 1961. 3 с.
Палеміка К. Мерляка з газэтаю.

1788. **“Моўныя рэсурсы Амэрыкі”, праект Міністэрства Асьветы ЗША.**
“Беларуская Моладзь”, №4, 1961. Дадатак.
New York, printed by M. Kazlakoŭski, 1961. 3 с.

1789. **Памяці Духоўнага Айца й барацьбіта за волю Беларусі.**
Нью Ёрк, Арганізацыйны Камітэт, сакавік 1961.
Сябры Арганізацыйнага Камітэту: Царкоўная Рада Прыходу Сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку, Задзіночаньне Беларускіх Вэтэранаў у Нью Ёрку.
Заклік ахвяраваць на помнік а. Ф. Данілюку. Дэклярацыя ахвяраваньня. Некалькі лістоў-заклікаў, якія шырака разыходзіліся.

1790. **Парадак тыдня студыяў у Чыкага 1–5 ліпеня 1961 (зацьверджаны канчаткова 18 чэрвеня 1961).**
Чыкага, Выканаўчы камітэт тыдня студыяў, 1961. 4 с.

1791. **“Паўлінка”, беларуская камэдыя Янкі Купалы ў выкананьні Беларускага Драматычнага Гуртка.**
Detroit, Mich., April 30, 1961. 4 с.
Program.
Дзейныя асобы; кароткі пераказ зьместу. У ангельскай мове.

1792. **Прачхнімася й ратуйма нашу эміграцыю дзеля народу свайго!**
“Палітычная эміграцыя...”.
Нью Ёрк, 1961. 2 с.
Заклік “ініцыятыўнага груду” стварыць арганізацыю для падтрыманьня школаў, выдавецтва; “за пісьменнасьць па-вялікалітоўску”. Сьпіс ініцыятыўнае групы. Ініцыятыва Я. Станкевіча.

1793. **Радкевіч, А[палёнія].**
Беларускі лемантар.
Саўт Рывэр, Н.Дж., Парафіяльны Камітэт Беларускай Праваслаўнай Царквы Сьв. Еўфрасіньні, 1961. 88 с.
Перавыд. з 1946 г. Перавыдадзены таксама разразны альфабэт, які далучаўся да лемантара.
*Гл.* Радкевіч, А., 1946.

1794. **Рэзалюцыя 9-га Кангрэсу БАЗА ў справе нацыянальна-ідэялягічнага становішча БАЗА.**
[Нью Ёрк, 28 траўня 1961]. 2 с.
БАЗА стаіць на прынцыпе Беларускае Дзяржаўнасьці ў форме БНР.

1795. **Справаздача Рэдкалегіі часапісу “Беларуская Моладзь” за пэрыяд ад сьнежня 1958 г. да жніўня 1961 г. (№№1–10).**
New York, Brooklyn, 1961. 3 с.
*Гл. таксама:* Справаздача..., 1960.

1796. **Станкевіч, Я.,** др.
У справе ўкладаных ангельска-беларускага і беларуска-ангельскага слоўнікаў.
Нью Ёрк, красавік 1961. 3 с.
Крытыка працы слоўнікавай камісіі БІНІМу.

1797. **Старажоўскі, Кастусь.**
30 гадоў на службе роднай культуры.
Дэтройт, Беларускае Выдавецтва "Сьвет", 1961. 13 с.
Біяграфія й літаратурна-навуковая дзейнасьць праф. Ул. Сядуры-Глыбіннага; партрэт. Добрая бібліяграфія.

1798. **Старая песьня на новы лад – адказ спадару Пануцэвічу.**
"У газэце "Бацькаўшчына"...".
Аўстралія – Мэльбурн, Праваслаўнае Брацтва Сьвятога Юрыя-Пераможцы, БАПЦ, 1961. 3 с.

1799. **Статут Беларускай Праваслаўнай Царквы на Чужыне.**
Праект.
[Саўт Рывэр, Н.Дж.], 1961. 19 с.

1800. **Сурвіллы, Янка і Івонка.**
[Беларускія паштоўкі].
Мадрыд, 1960–1961. Каля 10 рэпрадукцыяў. Чорна-белыя.
Сэрыя рэпрадукцыяў з абразоў І. Сурвіллы на тэму беларускае архітэктуры: "Руіны замку ў Вільні", "Руіны Наваградзкага замку", "Царква Сьв. Ільлі ў Віцебску", "Маламажэйкаўская царква".

1801. **Тумаш, Вітаўт.**
Аўхім Карскі. Жыцьцё, навуковая спадчына, пагляды. 1861–1931.
Нью-Ёрк, БІНІМ, 1961. 95 с.
Праца часткова публікавалася раней. Дапоўненая, перарэдагаваная. Быў намер ілюстраваць працу здымкамі з выстаўкі, прысьвечанай Я. Карскаму ў Нью-Ёрскай Публічнай Бібліятэцы. Поўны тэкст быў надрукаваная ў: Вітаўт Тумаш. Выбраныя працы. Мінск, 2002. (Бібліятэка часопіса "Беларускі Гістарычны Агляд"; 9.)
*Гл.* "Бацькаўшчына", №542, 1961.

1802. **Урачыстае высьвячэньне Беларускае Царквы Хрыста Спаса 2 ліпеня 1961.**
Chicago, ліпень 1961. 3 с.
Праграма высьвячэньня.

**Успамінальная кніжка БАПЦ.**
*Гл.* Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, 1961.

1803. **Юхнавец, Я.**
Новая Элегія: [Зборнік паэмаў].

[Нью Ёрк, 1961]. 18 с.
*Гл. таксама:* Юхнавец, 1964.

1804. **Belorussians (Whiteruthenians) in Chicago, Ill.**
International Folk Fair, November 11–12, 1961. 4 p.
Праграма; зьвесткі пра беларускую царкву Хрыста Спаса ў Чыкага.

1805. **Biełaruskaja Centralnaja Rada.**
Paviedamleńnie.
London, 1961. 2 s.
Паведамленьне пра выхад англамоўнае кнігі "Russia – the Suburb of Hell" Віктара Астроўскага. Аналіз імпэрскай палітыкі Расеі. Абвестка публікавалася таксама ў: "Аб'еднаньне", Лёндан, №3(90), 1961.

1806. **Byelorussia.**
[New York], выдавецтва БАЗА(?), 1961. 4 p.
Кароткі нарыс гісторыі й сучасны стан Савецкай Беларусі. У ангельскай мове.

1807. **Byelorussian-American Assn., Inc.**
Celebration of 43rd Anniversary of Byelorussia's Independence Day. The Hon. Samuel S. Stratton, 32nd District, N.Y. will be present...
New York, March 20, 1961. 2 c.

1808. **Byelorussian-American Association, Inc.**
Resolution sponsored by the Byelorussian-American Association, unanimously adopted at the mass meeting commemorating the 43rd anniversary of Byelorussian Independence on March 26, 1961 at the Bilmore Hotel in New York City.
New York, 1961. 3 p.

1809. **Byelorussian Autocephalic Orthodox Church in America.**
"An Act of Incorporation...".
New York, State of New York, in Assembly, February 7, 1961. 20 p.
Праўнае становішча парафіяў БАПЦ у ЗША... дакумэнт №3933, February 7, 1961.
*Гл. таксама:* Акт..., 1961.

1810. **Ciechanowiecki, Andrzej.**
Michał Kazimierz Ogiński und sein Musenhof zu Slonim.
Köln–Graz, Bohlau Verlag, 1961. 212 S. (Beiträge zur Geshichte Osteuropas; Band 2.)
Беларускі пераклад: Анджэй Цеханавецкі. Міхал Казімір Агінскі і яго "Сядзіба Музаў" у Слоніме. Мінск, "Беларусь", 1993. 174 с. Пераклад Уладзімера Сакалоўскага.

1811. **Confusion in English terminology "White Russians" and "Russian Whites".**
London, Byelorussian Central Council, Oct. 5, 1961. 2 p.
Друк Віктара Астроўскага.
Дадаецца бібліяграфія.
*Гл. таксама:* Ostrowski, W., 1958, 1964, 1967.

1812. **Constitution of Byelorussian Orthodox Church in South Australia incorporated.**
[Australia], 1961. 11 p.
Статут і рэгулямін БАПЦ у Аўстраліі.

1813. The **Independence of Byelorussia.**
New York, March 1961. 1 p.
Улётка, раздавалася прадстаўнікам друку ў часе адзначэньня Дня Незалежнасьці 25 Сакавіка ў Нью Ёрку.

1814. **Instrukcyja ab pracy ŭ addziełach Biełaruska-Amerykanskaha Zadzinočańnia.**
New York, lipień 1961. 2 c.
*Подпіс:* Kastuś Mierlak, Staršynia Hałoŭnaje Upravy BAZA.

1815. **Kraŭcoŭ, Makar.**
Biełaruski Nacyjanalny himn = Byelorussian National Anthem. English translation by Vera Rich.
London, Byelorussion Central Council, November 1961. 2 p.
Тэкст гімну "Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Падрыхтаваў да друку Віктар Астроўскі.

1816. **Lićvin.**
Lithuania-Litva – the historical name of Byelorussia.
New York, Supplement no. 5 to Byelorussian Youth, 1961. 2 p.
Reprint by International Institute of Byelorussian Studies St. Euphrosine of Polacak.

1817. **Loewenstein, Karl.**
Minsk im Lager der deutschen Juden.
Bonn, Hrsg. von der Bundeszentrale für Heimatdienst, 1961. 58 S. (Bonn, Heimatdienst, Bundeszentrale, Schriftenreihe; Heft 51.)
Габрайскае гета ў Менску ў часе II сусьветнае вайны.
Бібліяграфія ў падрадковых заўвагах.

1818. **Manifesto Frente de Libertacao dos Povos Subjugados Pelo Communisto.**
Brasil, Julho de 1961. 4 p.
Маніфэст: вызваліць паняволеныя нацыі з-пад панаваньня камунізму. Беларусы – адныя з спонсараў. У партугальскай мове.
*Подпіс* (ад беларусаў): Iazep Śviatovitch.

1819. **Matarjały dla Volnaj Biełaruskaj Encyklapedyi ŭ *Lietuvių Enciklopedija***, tom 1–5, 1961. (Lithuanian Bibliographic Service; Vydańnie №46.)
*Гл. таксама:* Ružaniec, 1963.

1820. **Moskalik, Michael.**
Janka Kupala der Sänger des weissruthenishen Volkstums: Inaugural-Dissertation zur Erlangung des Doktorgrades... vorgelegt von Michael Moskalik aus Harodziej (Weissruthenien), 1959.
München, Otto Sagner Verlag, 1961. 241 S. (Slavistische Beiträge; Band 3.)
*Гл. таксама:* Moskalik, 1959.

1821. **Ostrowski, R.,** prof.
Fragments from the History of Byelorussia (to 1700).
Material for historical research and study of the subject.
London, Byelorussian Central Council, 1961. 103 p.
Агульны разгляд гісторыі. Нацыянальны сьцяг і герб у колерах.

1822. **Ostrowski, Wiktor.**
Confusion in English terminology – "White Russians" and "Russian Whites".
London, 1961. 5 p.
Тое, што й Confusion..., 1961. Улётка друкавалася двойчы.

1823. **Ostrowski, Wiktor.**
Russia the Suburb of Hell from Ivan Kalita to Khrushchev Nikita.
London, Byelorussian Central Council, 1961. 84 p.
Аналіз расейскага імпэрыялізму.

1824. **Paŭlinka by J. Kupala.**
[Chicago], 1961. 1 c.
Рэклямная ўлётка пра беларускі тэатральны вечар.

1825. [**Ružaniec-Ružancovas, A.,** ukł.].
Materyjały dla Volnaj Biełaruskaj Encyklapedyi ŭ "Lietuvių Enciklopedija", tom I–V, 1961.
[Danville, Ill., Lithuanian Bibliographic Service, 1961. 6 p.] (Lithuanian Bibliographic Service; Vydańnie №46.)
Аўтар вызначае матар'ялы, якія можна скарыстаць для беларусазнаўства.

1826. **Ružaniec, Volsa [Ružaniec-Ružancoŭ, Alaksandra],** ukł.
Zapisy i Konadni, 1952–1958. Pakaźnik artykułaŭ.
Danville, Ill., Lithuanian Bibliographic Service, 1961. 13 s. (Litoŭskaja Bibliografičnaja Słužba; Vydańnie №41.)
*Гл. таксама:* Ružaniec, 1959.

1827. **Ryžy-Ryski, Uładysłaŭ,** układalnik.
Biełaruski Katalicki Imšał / Biełaruskaja Chryścijanskaja Subožnia (Kaścioł) Naślednica "Litoŭskaje Jadnoty".
Princeton, 1961. 15 s.
"Dla niadzielnaha i prynahodnaha ŭžytku...".
S. 4 вокладкі: Order for the Celebration of the Sacrament of the Lord's Supper of Holy Communion..., [адрас]: Rahway – Princeton, N.J., USA.

1828. **Ryžy-Ryski, Uładysłaŭ,** ksiondz.
Прырода аўтарытэту ў Субожні = The nature of authority in the church.
Princeton, 1961. 11 p.
P. 3 вокладкі: Byelorussian version of the Theological Essay.
Тытул кірыліцаю, тэкст лацініцаю.

1829. **Ryžy-Ryski, Uladyslaŭ,** Dr.
The Reformation in Byelorussia.
Princeton, Board of Scientific Research "Leu Sapieha" of the Inst. of Byelorussian Studies of Euphrasinia of Polacak, 1961. 67 p.
Рэфармацыя на Беларусі. Абшырная бібліяграфія; крыніцы.
Адварот тытула: The Reformation in Byelorussia (Whiteruthenia). Introduction, with documentary illustration by Uladyslaŭ Ryžy-Ryski. Princeton Theological Seminary, 1959–1960.

1830. **Shmeruk, Chone.**
The Jewish Kibbutz and the Jewish agricultural settelments in Soviet Bielarus, 1918–1932.
Jerusalem, Hebrew University, Ph.D. Dissertation, 1961. 11+192+ +22+xxii p.
Доктарская дысэртацыя: габрайскія сельскагаспадарчыя грамады ў БССР. Праца добра ведамая англамоўным дасьледнікам. У мове іўрыт.

1831. The **Solemn Blessing, July 2, 1961.**
Урачыстае Высьвячэньне Беларускае Царквы Хрыста Спаса.
Чыкага, 1961. 3 с.
Два варыянты праграмы: у беларускай і ангельскай мовах, розных фарматаў.

1832. The **Solemn Blessing of the Byzantine-Slav. Rite Christ the Redeemer R. C. Church by His Excellency Most Reverend Cheslaus Sipovich, D.D. titular Bishop of Mariamme.**
Chicago, July 2, 1961. 17 p.
Таксама ёсьць праграмы на 2 с.
Высьвячэньне біскупа Часлава Сіповіча.

1833. **Škoła-internat dla biełaruskich chłapcoŭ.**
Adozva.
London, 15 lutaha 1961. 1 s.
Заклік-інструкцыя пра паступленьне ў беларускую школу-інтэрнат.

1834. **[Šymaniec, Ul.].**
Le genocide en Bielorussie.
[Paris], 1961. 2 p.
Кароткі аналіз дэмаграфічных стратаў Беларусі пад расейскай акупацыяй.
Часткова публікавалася.

1835. **[Šymaniec, Ul.].**
De Kastus Kalinouski au 25 mars 1918. La marche vers indepedence.
Paris, 1961. 2 p.
Агляд беларускага палітычнага руху перад 1918 г.

1836. **Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America.**
Запросіны на зьезд беларусаў ЗШП Амэрыкі й Канады.
Чыкага, 2–3 верасьня 1961.

1837. **Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America.**
Memorandum... Soviet Russia is continuing its traditional aggression.
New York, March 16, 1961. 3 p.
Аб экспансіянізьме Расеі.

1838. **Why does Voice of America discriminate against the Byelorussian language?**
New York, [Byelorussian Youth Association of America], 1961. 2 p.
[Аўтары: Я. Запруднік, В. Кіпель, Ю. Станкевіч].
Улётка распаўсюджвалася разам з часапісам "Беларуская Моладзь". Ува ўлётцы падаюцца аргумэнты на карысьць увядзеньня беларускае мовы ў праграмы радыёстанцыі "Голас Амэрыкі"; заклік да грамадзтва зьбіраць подпісы й высылаць іх амэрыканскім сэнатарам і кангрэсмэнам; далучаныя таксама лісты з адрасамі некалькіх сэнатараў і кангрэсмэнаў.

1839. **Wierbicki, Eugen.**
Official United States Food Ind. Research Team to U.S.S.R. June 27 – July 26, 1960.
Waterloo, Iowa, 15.III.1961. 140 p.
Справаздача-агляд савецкае харчовае прамысловасьці.
Др. Аўген Вярбіцкі – дзейны сябра БІНІМу, уплывовы й ведамы навуковец ЗША.
У Калекцыі два асобнікі гэтага дакумэнта: адна падараваная В. Тумашу, другая – В. Пануцэвічу. Часткі дакумэнта друкаваліся.
*Гл. таксама:* Wierbicki, 1968.

1840. **Zapisy i Konadni,** pakaźnik, 1961. (Lithuanian Bibliographic Service; Vydańnie №41.)
*Гл. таксама:* Ružaniec, 1963.

## 1962

1841. **Аб'ява.**
[Беларуска-Амэрыканскі Кангрэсавы Камітэт штату Нью Джэрзі заклікае галасаваць за кандыдатаў дэмакратычнае партыі...].
Саўт Рывэр, кастрычнік 1962. 1 с.
Адозва ў падтрымку дэмакратаў. Зазначана, што кангрэсмэн Ч. Джоелсан выступіў у Кангрэсе ЗША ў зьвязку з адзначэньнем 43-х угодкаў БНР.

1842. **Аддзел С.С.Ф. (Студэнцкага Стыпэндыяльнага Фонду) пры Ц.Б.А.А. (Цэнтралі Беларускіх Акадэміцкіх Арганізацыяў) у ЗША.**
Форма сплаты пазыкі...
[ЗША, 1962]. 1 с.
*Гл. таксама:* Філія С. С. Ф., 1959.

1843. **Акула, Канстантын.**
Змагарныя дарогі = Combat Trails: Аповесьць.
Торонто–Мюнхэн, выданьне аўтара, 1962. 583 с.
Уступы: др. Ст. Станкевіч і аўтар.
Вокладку рысаваў Мячыслаў Рачыцкі.
Успаміны: гісторыя беларускай афіцэрскай школы ў Менску ў 1944 г. С. 9: верш Ул. Жылкі "Меч", *прысьвячэньне:* Сябром із школы камандзераў Беларускае Краёвае Абароны ў Менску.
*Рэц.:* "Бацькаўшчына", №585–586, Праваслаўныя Каляды, 1962; №593, 20 травеня 1962; "Беларус", №75, сакавік 1962.
Перавыд: Кастусь Акула. Змагарныя дарогі: Раман. Мінск, Мастацкая літаратура, 1994. 572 с. (Галасы беларускага замежжа.) Прадмова Уладзіміра Арлова.

1844. **Амэрыканска-Беларускае Культурна-Дапамаговае Аб'еднаньне.**
Запросіны... Зьезд Беларусаў ЗША і Канады...
Cleveland, 4 жніўня 1962. 1 с.
*Подпіс:* А. Сацэвіч, старшыня.

1845. **Афінагорас I,** Патрыярх Усяленскі.
Пратакол №787. Пераклад з грэчаскай мовы. Копія.
Царгорад, 18.9.1962. 2 с. 3 асобнікі.
Нязгода ў беларускай царкве Аўстралійска-Новазэляндзкае Епархіі. Крытыка БАПЦ.

1846. **Багровіч, Андрэй [Вітаўт Тумаш]**
Жыхарства Беларускае ССР у сьвятле перапісу 1959 году = Population of the Byelorussian SSR in the 1959 Census / БІНІМ.
Нью Ёрк–Мюнхэн, Коштам Фундацыі імя П. Крэчэўскага, 1962. 88 с.
Аналіз дэмаграфічных score стратаў Беларусі за гады II сусьветнае вайны: каля 6 мільёнаў. Рэзюмэ ў ангельскай мове.

1847. **Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Кафедральны Сабор Сьв. Кірылы Тураўскага.**
Часовы статут Сяструцтва Жыровіцкае Іконы Божае Маці.
Нью Ёрк, 1962(?). 3 с. 50 асобнікаў.
Рассылалася для азнаямленьня.

1848. **Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква. Прыход Божай Маці Жыровіцкай у Нью Брансьвік.**
"Вельмі паважаны спадар...".
Нью Брансьвік, люты 1962. 1 с.
Заклік фінансава дапамагчы ў куплі царквы. Пляны й стан прыходу.
*Подпісы:* А. Стагановіч, старшыня; В. Русак, сакратар Царкоўнай Рады.

1849. **Беларуская Школа імя Сьвятога Кірылы Тураўскага ў Лёндане.**
Праспэкт.
London, 1962. 3 с.
Інфармацыя пра школу.

1850. **Беларуская Школа імя Сьвятога Кірылы Тураўскага ў Лёндане.**
St. Cyril's House. Boys Uniform and Personal Outfit.
London, 1962. 4 с.
Вымогі школы.

1851. **Беларуская Царква Хрыста Спаса.**
"Дарагія Браты й Сёстры...".
Chicago, 1962. 1 с.
Адзначэньне ўгодкаў заснаваньня парафіі.
*Подпісы:* Антон Беленіс і Джан Бэрн.

1852. **Беларускі Каляндар на 1962 год.**
South River, N.J., друкаваў А. Даніловіч, студзень 1962.
Памесячны; назовы месяцаў у беларускай і ангельскай мовах; пазначаныя дзяржаўныя амэрыканскія й беларускія нацыянальныя ды рэлігійныя сьвяты.

1853. **Гарун, Алесь.**
Матчын Дар.
Нью Ёрк, БІНІМ, "Бацькаўшчына" (München), 1962. 270 с.

Матар'ялы выбраныя са зборнікаў Алеся Гаруна 1918, 1929 гг. Вокладка М. Наўмовіча. Тытул таксама ў нямецкай і ангельскай мовах. Уступ А. Адамовіча. Перадрук уступу А. Барычэўскага. Творы папярэдне публікаваліся ў: "Бацькаўшчына", №530–531, 1960 – №575, 1961.

1854. **Гэрмановіч, Язэп,** айцец.
Кітай–Сібір–Масква (Успаміны).
Мюнхэн, Logos, 1962. 292 с.
Партрэт аўтара і ягоная прадмова.
З дазволу Духоўных Уладаў.
Пераклад: польскі: 1966; літоўскі: 1966; італьянскі: 1969.
*Рэц.:* "Бацькаўшчына", №598, 28 кастрычніка 1962; №607, 15 чэрвеня 1963; "Барацьба", Штутгарт, №54, кастрычнік 1964, с. 17.

1855. **Журба, Галіна.**
Смаргонські ведмеді і Хахландья. Підсумки одної афери.
Нью-Йорк, друковано коштом Авторки, 1962. 19 с. (Нариси сучасности; 1.)
Русіфікацыя Украіны й Беларусі. Параўнаньне з Смаргонскай Акадэміяй дрэсіроўкі мядзьведзяў.

1856. **Жывіца, Юры.**
Журавель: Расказы.
[Пірманэнс], выданьне "Вехаў", 1962. 20 с.

1857. **Жывіца, Юры.**
Па чужых кутках: Расказы.
[Нямеччына], выданьне "Вехаў", 1962. 20 с.

1858. **Жывіца, Юры.**
Праз сьлёзы: Зборнік твораў. [Выд. 2].
[Нямеччына], выданьне "Вехаў", 1962. 20 с.
10 апавяданьняў.
Выд. 1: 1951.

1859. **Жывіца, Юры.**
Сын: Аповесьць. [Выд. 2].
[Нямеччына], выданьне "Вехаў", 1962. 29 с.
Выд. 1: 1950.

1860. **Жывіца, Юры.**
Сьвеціць у тумане: Аповесьць.
Разьдзелы 29–44.
[Нямеччына], выданьне "Вехаў", 1962. 25 с.
С. 24: Папярэднія разьдзелы аповесьці "Сьвеціць у тумане" друкаваліся ў "Барацьбе" за 1961 год.
*Гл.*"Барацьба", №42, чэрвень 1961 – №47, сьнежань 1961.

1861. **Жывіца, Юры.**
Сьвеціць у тумане: Аповесьць.
Разьдзелы 45–60.
[Нямеччына, Шварцвальд Шэмбэрг бай Кальв, Ное Гайльштэтэ, пакой 91], выданьне “Вехаў”, 1962. 29 с.
С. 29: аўтар падае месца, дзе пісалася аповесьць, і час: “пісана ад 6.12.1948 да 4.1.1949”.

1862. **Жывіца, Юры.**
Сьвеціць у тумане: Аповесьць.
[Нямеччына], выданьне “Вехаў”, 1962. 99 с.
Усе разьдзелы сабраныя разам.

1863. **Жывіца, Юры.**
Умелы падыход: Расказы.
[Нямеччына], выданьне “Вехаў”, 1962. 20 с.
Зборнік апавяданьняў.

1864. **ЗБШІл (Згуртаваньне Беларусаў Штату Іллінойс).**
25 сакавіка 1918–1962.
Chicago, 1962. 4 с.
Праграма.

1865. **Змагар, Алесь.**
Да згоды: Вершы = To an agreement: Byelorussian Verses.
Кліўленд, выдавецтва Літаратурнай Сустані “Баявая Ускалось”, 1962. 64 с.
Мастак E. Stiver; мастацкі рэдактар Аскольд Я. Емець.
Партрэт; сьпіс кніг аўтара.
Выд. 2: 1963.

1866. **[Змагар, Алесь].**
Змагарны шлях.
[Кліўлэнд, 1962]. 3 с.
П’еса-мантаж. Ставілася ў Кліўлэндзе.

1867. **Камітэт Набыцьця Беларускага Цэнтру Адпачынку.**
Аб’ект: Bel-Air, Glen Spey, N.Y.
Нью-Ёрк, 23 верасьня 1962. 1 с.
*Подпіс:* Ю. Станкевіч.

1868. **Камітэт Набыцьця Беларускага Цэнтру Адпачынку.**
Праэкт Статуту.
Нью-Ёрк, восень 1962. 2 с.

1869. **Камітэт Набыцьця Беларускага Цэнтру Адпачынку.**
Сход... Запросіны...
Нью-Ёрк, 29 верасьня 1962. 1 с.

Разам з запросінамі рассылалася інфармацыйная ўлётка пра фінансавыя справы. Кошт Бэлэру $65.000. (В. К.)

1870. **Кіёск.**
Беларускія кружэлкі: [Каталёг].
Нью Ёрк, Кіёск ЗБМА, красавік 1962. 1 с.

1871. **Кіёск ЗБМА ў Нью Ёрку.**
[Каталёг друкаў].
Нью Ёрк, красавік 1962. 2 с.
*Гл. таксама:* Byelorussian Youth..., 1962.

1872. **Міцкевіч, М.**
Калядны вечар: П'еса.
Нью Ёрк, БАЗА, 1962. 5 с.

1873. **Міцкевіч, М.**
Цудоўная ноч: [П'еса].
New York, БАЗА, 1/14/1962. 4 с.

1874. **Пануцэвіч, В.,** укладальнік.
Вершы для дзяцей I–II групы.
Чыкага, 1962. 119 с.

1875. **Пятая сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі.**
Праэкт праграмы.
Таронта, Сакратарыят ЗБК, 16-га ліпеня 1962. 1 с.

1876. **Пятая сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі, Таронта, 1–3 верасьня 1962.**
[Toronto], 1962. 4 с.
Праграма. У беларускай і ангельскай мовах.
Дэвіз сустрэчы: Freedom for Byelorussia – Victim of Moscow Colonialism.

1877. **Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.**
Дарагія Суродзічы!
Чыкага, сакавік 1962. 2 с.
Сустрэча з прэзыдэнтам М. Абрамчыкам.

1878. **Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Урад Б.Н.Р.**
Беларуская палітычная эміграцыя...
Нью Ёрк, 20 чырвеня 1962. 1 с.
Заклік фінансава дапамагчы ўраду БНР.
*Подпіс:* Францішак Кушаль, Старшыня Ураду БНР.

1879. **Сноп, Уладыслаў [У. Рыжы-Рыскі].**
Маці маёй роднай = To the Mother of my Birth: Вершы.
Прынстон, выданьне Навукова-Дасьледчай рады "Льва Сапегі" Інтэрнацыянальнага Інстытуту Беларусаведы імя Эўфрасіньні Полацкай, 1962. 20 с.

"Słova ad aŭtara", лацініцаю. Інфармацыя пра аўтара; артыкул "Lithuania–Litva", у ангельскай мове. Гішпанскі пераклад верша М. Кавыля.

1880. **Станкевіч, Янка.**
Ратуйма скарбы свайго народу.
Нью Ёрк, Крывіцкае Навуковае Таварыства Праньціша Скарыны, [1962]. 5 с. Выд. 2, крыху зьмененае.
Інструкцыя для зьбіраньня геаграфічных назоваў.
Выд. 1: *гл.* Крывіцкае Навуковае Таварыства..., 1961.

1881. **Статут Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы Парафіі Сьвятое Жыровіцкае Божае Маці ў Кліўленд.**
Кліўленд, 1962. 5 с.

1882. **Статут Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Амэрыцы = By-laws of the Byelorussian Youth Association of America.**
New York, 1962. 10 с.

1883. **Тытулярны пастар Копыльскага Кальвінскага Касьцёлу ксёндз Людвік Галубовіч, апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў у Заходняй Эўропе...**
Адкрыты ліст В. Кляшчу, Аўстралія.
München–Gladbach, 5 лютага 1962. 3 с.

1884. **Яго Высокапрэасьвяшчэнства Высокапрэасьвяшчэньнейшага Архіяпіскапа Сергія... Галавы БАПЦ на Захадзе...**
"Распараджэньнем Архірэйскае Канцэлярыі пастаноўлена...".
Аўстралія, БАПЦ, 1962. 1 с.
Адлучэньне Архімандрыта Мадэста ад БАПЦ 11.08.1962.
*Подпісы:* Архіяпіскап Сергій, Мітрафорны пратаярэй Міхаіл Шчурко.
*Гл. таксама:* Модэст..., 1963.

1885. **Biełaruskija Piśmeńniki ŭ SSSR:** Adrasar.
Nju Jork–Taronto, Usiebiełaruski Archiŭ, seryja D1, 1962. [Бп.].
Альфабэтычны ўклад.

1886. **Byelorussian Youth Association of America.**
Новыя кнігі ў кіёску ЗБМА, люты-сакавік 1962.
New York, 1962. 2 p.
*Гл. таксама:* Каталёг..., 1961.

1887. **Chinitz, N.** and **Sh. Nachmani,** editors.
Slutzk and vicinity. Memorial book. Hlusk, Horki, Hresk, Hrozova, Kapyle, Luban, Pohost, Romanova, Shemezeva, Stari Dorogi, Starobin, Timkowitz, Uretche, Verchutin, Vizna.
New York–Tel Aviv, Yizkor Book Committee, 5722, 1962. XXX+ +541 p.

Жыцьцё беларускіх габраяў у вышэйпералічаных мястэчках. Здымкі, імёны.
Тэкст у мовах іўрыт і ідыш. Рэзюмэ ў ангельскай мове.
Бібліяграфія мэмарыяльных кнігаў на іўрыт і ідыш *гл.* В. Зайка "Запісы", БІНІМ, Нью Ёрк, №24, 1999.

1888. **Founder's Day June 17, 1962.**
Chicago, Church of Christ the Redeemer, 1962. 3 p.
Біяграфія а. Яна Тарасэвіча. Гісторыя парафіі.

1889. **Gitlin, Clara S.**
"Dear Friend... translation of the Bible into Whiterussian...".
Cleveland, Christmas 1962. 1 p.
Каляднае вітаньне сям'і пастара М. Гітліна й паведамленьне пра пачатак перакладаньня Бібліі ў беларускую мову.

1890. **Glossarium archaeologicum** / Union internationale des sciences pré- et protohistoriques.
Fasciculum 7–13: Bonn, Rudolf Habelt Verlag–Warszawa, PWN, 1962.
Konrad Jażdzewski redigenda curavit; Comité de Rédaction: Jan Filip, Christopher F. C. Hawkes, Konrad Jażdżewski.
Беларускі матар'ял: табліца 9 кожнага выпуску (Fasciculum).
Працяг выд.: Fasciculum 14–26. Warszawa, PWN, 1965.

1891. **Kamunikat pałomnictva ŭciekačoŭ u Rym.**
London, 16 ліпеня 1962. 1 s.
*Подпіс:* a. A. Nadson.

1892. **Kohn, Hans.**
Russen. Weissrussen. Ukrainer.
Frankfurt an Main und Hamburg, Fischer Bücherei, Mai 1962. 282 p.
P. 209–225: разьдзел пра беларусаў. Аўтар Peter Scheibert.
Гэты разьдзел быў выдадзены таксама асобнаю брашурай.

1893. **Lewanski, Richard.**
A Bibliography of Slavic Dictionaries. Vol. II: Belorussian, Bulgarian etc.
New York, The NYPL, 1962. XVIII+366 p.
P. 9–26: беларускія слоўнікі (86 пазыцыяў).
*Рэц.:* "Запісы", БІНІМ, München, №3(9), 1964.
Разьдзел, прысьвечаны беларускім слоўнікам, часта падаваўся як асобнае выд. (В. К.)

1894. **Losik, Anton.**
Biełaruski pravapis.
Перавыд. а. Ф. Чарняўскага, 1962.
Перавыд. з: Miensk, 1943. 72 s.

1895. **Messianic Message.**
Golden Jubilee for Moses H. Gitlin.
Dayton, Tennessee, May 16, 1962. 2 p.
Біяграфія Масея Гітліна – габрайскага дасьледчыка-хрысьціяніна, які ўдельнічаў у перакладаньні Бібліі ў беларускую мову.

1896. **Ostrowski, Wiktor,** compiler.
Mr. Dean Rusk, "English Jargon", UNESCO, Politics and Byelorussia. Material for historical research and study.
London, 1962. 19 p.
Палітычнае становішча Беларусі, імпэрская палітыка Масквы й неразуменьне расейскае палітыкі Захадам.

1897. **Pichura, Gavriil.**
Church Music in Byelorussia.
London, 1962. 23 p.

1898. **Pichura, Gavriil P.**
Monuments of Byelorussian Church Music.
Адбітак (пераплецены) з: "Eastern Churches Quarterly", London, 1962, vol. 16, p. 410–415.
У Калекцыі – асобнік, падараваны праф. М. Куліковічу, падпісаны аўтарам.

1899. **Programme of the Poetry Reading held to commemorate the Twentieth Anniversary of the death of the Byelorussian Poet Janka Kupala (1982–1942) held at Petytt House Chelsea, London on Sat., Oct. 6, 1962.**
London, 1962.
*Гл. таксама:* Twentieth..., 1962.

1900. **Ramsey, Robert E.**
Flags of the Captive Nations.
Denver, Colorado, 1962. 16 p.
Падрыхтоўка закону й поўны тэкст заканадаўчага акту аб паняволеных народах "Public Law 89-90", прынятых 86-м Кангрэсам ЗША ў ліпені 1959 г. Беларускія арганізацыі бралі ўдзел у падрыхтоўцы "Закону 89-90" й выданьні кніжкі.

1901. **Resort Belair-Miensk, Inc.**
Rates price-list.
New York-Glen Spey, NY, 1962. 4 p.
Падрыхтоўка да сэзону 1963 г.; цэны на пакоі; праграмы.

1902. **Rešeć, J.,** Ks. Dr.
Karotki Katechizm dla Biełarusaŭ-Katalikoŭ.
ЗША, 1962.
Перавыд. з: Wilnia, Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, 1927. 46 s.

1903. **Saint Aloysius Alter and Rosary Society.**
[...Christmas in White Russia].
Chicago, 1962. 2 с.
Інфармацыйная ўлётка пра беларускія калядныя звычаі. У беларускай і ангельскай мовах.

1904. The **Twentieth Anniversary of the Death of Janka Kupala (1882–1942 – Oct. 6, 1962).**
London, Commemorative Committee, 1962. 4 p.
Праграма ўрачыстасьці. Невялікая зацемка пра Беларусь.
*Гл. таксама:* Programme..., 1962.

1905. **Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America.**
Very Honorable... The Conference... Cleveland, 2, 1962.
New York, Oct. 1, 1962. 4 p.
*Подпіс:* І. Касяк.

## 1963

1906. **Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА).**
Інструкцыя ў справе сяброўства БАЗА й сяброўскіх складак.
Нью Ёрк, Галоўная Управа БАЗА, 15 чэрвеня 1963. 2 с.

1907. **Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, Катэдральны Сабор Сьв. Кірылы Тураўскага.**
Фінансавая справаздача ад 1.X.1961 да 30.IX.1963.
Нью Ёрк, БАПЦ, 1963. 2 с.

1908. **Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва.**
Агляд беларускай палітычнай дзейнасьці ў Заходняй Эўропе ў міжваенныя гады, зроблены Вітаўтам Кіпелем.
Нью Ёрк, 1963. 16 с. 20 асобнікаў.
Частковая пазьнейшая публікацыя: "Беларусіка", Мінск, №6, 1997, с. 280–286; "Кантакты і дыялогі", Мінск, №9, 1996, с. 20–25. Дадатковыя зьвесткі пра беларускі ўдзел у міжнародных эўрапейскіх канфэрэнцыях друкаваліся асобнымі адбіткамі, а таксама ў справаздачах-кнігах: Conference des groupes nationaux organisés des Etats Européens en 1925 à Geneve, Premiere, Compte-rendu:
• Першая канфэрэнцыя, Genf, 1925. Ад беларусаў выступаў др. Костка (с. 21–22).
• Канфэрэнцыя, Genf, 29–31 жніўня 1928. Выдрукавана: Wien – Leipzig, In Kommission bei Wilhelm Braumüller Universitäts – Verlagsbuchhandlung, 1928. Ад беларусаў выступіў Ф. Ярэміч (с. 83–85) (*гл.* газэту "Діло", Львів, ч. 201, 8 вер. 1928, передрук з газэты "Der Morgen", Wien, №554, Sept. 1928).

• Канфэрэнцыя, Bern, 16–19 верасьня 1933. Sitzungsbericht des Kongresses der organisierten nationalen Gruppen in den Staaten Europas. Выдрукавана: Wien–Leipzig, In Kommission bei Wilhelm Braumüller Universitäts – Verlagsbuchhandlung, 1934. Ад беларусаў выступаў інж. А. Клімовіч (с. 38–39).

• Канфэрэнцыя, Genf, 2–4 верасьня 1935. Выдрукавана: Wien–Leipzig, In Kommission bei Wilhelm Braumüller Universitäts – Verlagsbuchhandlung, 1936. Ад беларусаў надрукаваная адозва Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні (с. 50–51).

• Канфэрэнцыя, London, 14–15 ліпеня 1937. The Congress of the European National Minorities, no. 13, Transactions... Выдрукавана: Wien–Leipzig, In Kommission bei Wilhelm Braumüller Universitäts – Verlagsbuch – handlung, 1938. Беларускі даклад кс. Адама Станкевіча; перадрукаваны таксама ў: Byelorussian Statehood, 1988.

1909. **Беларускі Каляндар на 1963 год.**
South River, N.J., друкаваў А. Даніловіч, студзень 1963.
Памесячны; назвы месяцаў у беларускай і ангельскай мовах; пазначаныя амэрыканскія дзяржаўныя й беларускія нацыянальныя й рэлігійныя сьвяты.

1910. **Беларускі Нацыянальны Гімн.**
Словы Макара Краўцова. Музыка Уладзімера Тэраўскага. Пераклад у ангельскую мову Веры Рыч.
Саўт Рывэр, Н.Дж., сакавік 1963. 2 с. 100 асобнікаў.
Ноты з тэкстам у беларускай і ангельскай мовах.
Пазьней гэты друк пашыраўся на кожнай большай беларускай нацыянальнай акадэміі-вечары. Агульны наклад 1000.

1911. **Брага, Сымон [Вітаўт Тумаш].**
Доктар Скарына ў Маскве = Doctor Skaryna in Moscow / БІНІМ.
Нью Ёрк–Мюнхэн, 1963. 32 с.
Лёс выданьняў Ф. Скарыны ў Маскве. Выдатная ўдакумэнтаваная праца.
Перавыд.: Менск, 1993.
*Рэц.:* "Беларус", №85–86, красавік-травень 1964.

1912. **ВЭР [Янка Ролсан].**
Каржаваты і цыбаты: Байка.
[Аўстралія], сьнежань 1963. 6 с.

1913. **Глыбінны, Уладзімер.**
Смаленшчына – адвечная зямля беларускага народу: Гістарычны нарыс.
Нью Ёрк–Саўт Рывэр, выданьне Беларускага Выдавецкага Тава-

рыства, 1963. 44 с. (Бібліятэка Беларускай Думкі.)
*Гл. таксама:* Глыбінны, 1944.

1914. **Жывіца, Ю.**
З вінтоўкай у руках: Успаміны.
Нямеччына, выданьне "Вехаў", 1963. 31 с.
Успаміны беларускіх жаўнераў.

1915. **Жывіца, Юры.**
Песьня салаўя.
[Нямеччына], выданьне "Вехаў", 1963. 33 с.
*Гл.* Жывіца, 1955.

1916. **Жывіца, Юры.**
Пушча шуміць: Аповесьць.
[6781 Winsberg/Pirmasens, Western Germany, "Vechi"], 1963. 99 с.
Памяці Хведара Ільляшэвіча.

1917. **Зварот да беларуска-амэрыканскіх арганізацыяў і да ўсяго беларускага грамадзянства ў ЗШП Амэрыкі.**
Нью Ёрк, 5 траўня 1963. 2 с.
Зандаваньне грамадзкае думкі наконт стварэньня адзінае беларуска-амэрыканскае рэпрэзэнтацыйнай арганізацыі.
*Подпісы:* І. Касяк, старшыня Беларускага Кангрэсовага Камітэту Амэрыкі; К. Мерляк, старшыня Галоўнай Управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня.

1918. **Згуртаваньне Беларускіх Вэтэранаў, Аддзел Нью Ёрк.**
"Дарагія Сябры... большая актывізацыя вэтэранаў...".
Нью-Ёрк, люты 1963. 1 с.

1919. **Змагар, Алесь.**
Да згоды: Вершы. [Выд. 2].
Кліўленд, выдавецтва Беларускага Вызвольнага Руху, 1963. 63 с.
Бібліяграфія твораў аўтара.
Выд. 1: 1962.

1920. **Зьезд Беларусаў Амэрыкі і Канады.**
Рэзалюцыя ў справе стварэньня адзінай Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Амэрыцы і Канадзе, прынятая 1 верасьня 1963.
Саўт Рывэр, Нью Джэрзі, 1 верасьня 1963. 1 с.
Старшыня зьезду І. Касяк, сакратары: А. Даніловіч, М. Сенька.
За згоднасьць: Прат. М. Лапіцкі.

1921. **Камітэт Тыдня Студыяў у Чыкага.**
Парадак тыдня студыяў: 28 лістапада – 1 сьнежня 1963.
Чыкага, 25 ліпеня 1963. 2 с.

1922. **Касмовіч, Д.**
"Дарагія Суродзічы! У 43-ія ўгодкі Слуцкага Ўздыму...".

[Нямеччына], 1963. 2 с.
Вітаньне з угодкамі Слуцкага паўстаньня.
Матар'ял быў часткова скарыстаны нямецкім друкам.

1923. **Кіслы, К.**
Малебен.
Кліўленд, выданьне Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Кліўлендзе, 1963. 22 с., ноты.
На вокладцы: "З багаславенства Сьвяшчэннага Сабору Епіскапаў БАПЦ".

1924. **Крапіва-Жыгучка, Я. [Янка Ролсан].**
Ня казка, а быль.
[Аўстралія], верасень 1963. 6 с.
Гумарыстычная паэмка.

1925. **Крушына, Рыгор.**
Вячорная лірыка: Лірычныя творы (1957–1963).
Нью Ёрк–Мюнхэн, выданьне аўтара, 1963. 111 с.
Здымак аўтара. Вокладка мастака Д. Чайкоўскага.
*Рэц.:* "Беларус", №87, чэрвень 1964.

1926. **Крывіцкае Навуковае Таварыства ім. Праньціша Скарыны.**
[Пратакол Зьезду Таварыства 29 сьнежня 1962 г.].
Нью-Ёрк, 1963. 2 с.

1927. **Модэст,** Архімандрыт.
Адозва.
[Аўстралія, кастрычнік 1963]. 2 с.
Датычыць выхаду а. Мадэста з БАПЦ.
*Гл. таксама:* Яго..., 1962.

1928. **Паважаныя бацькі.**
"Сёлета, упяршыню ў ЗША... арганізуецца лягер моладзі...".
Glen Spey, N.Y., Belair-Miensk, 1963. 1 с.
Паведамленьне пра арганізацыю дзіцячага летніку; праграма летніку; зьвесткі пра кіраўніцтва.

1929. **Пануцэвіч, Вацлаў.**
Беларуская мова (граматыка і правапіс): Зборнік практыкаваньняў. Правілы: Для дзяцей ад 7 да 10 гадоў.
Чыкага, Беларуская Выдавецкая Сябрыня, 1963. 22 с.

1930. **Пануцэвіч, Вацлаў.**
[Карэспандэнцыя], 1959–1963.
Папка карэспандэнцыі з рознымі беларускім дзеячамі і актывістамі: Ст. Станкевічам, др. Ст. Грынкевічам, Б. Букаткам, Ю. Віцьбічам.
Сшытак першы: развагі аўтара пра сваю працу, жыцьцё белару-

скае палітычнае эміграцыі, царкоўныя справы; некаторыя ратагарныя ўлёткі ўшытыя ў карэспандэнцыю; таксама ўшытая біяграфія-нэкралёг а. Міколы Макарэвіча – першага сталага настаяцеля прыходу сьв. Маці Жыровіцкае ў Кліўлэндзе.
Сшытак другі: пераважна справы БАПЦ.
Большасьць матар'ялаў не друкавалася.
*Гл.* Волаціч, Мікола, БАПЦ, 1957.

1931. **[Пануцэвіч, В.].**
Мая чытанка.
[Чыкага, Беларуская Школа, 1963]. 40 с.
Кнігі I, II. Па 20 старонак.
Сустракаюцца разрозьненыя кніжка I і кніжка II.

1932. **Праграма Акадэміі, прысьвечанай 45-м угодкам абвешчаньня незалежнасьці БНР, 24 сакавіка 1963 г.**
[Нью-Ёрк], сакавік 1963. 4 с.

1933. **Праграма Тыдня Студыяў у Чыкаго 28 лістапада – 1 сьнежня 1963 г.**
Чыкаго, Беларускі Рэлігійна-Культурны Цэнтр, 1963. 4 с.

1934. **[Станкевіч, Я.].**
Да праграмы партыі.
Нью Ёрк, 1963. 7 с.
Разважаньні аб праграме партыі, якую, відавочна, аўтар меркаваў стварыць.

1935. **[Станкевіч, Я.].**
Задзіночанае Гаспадарства Беларускае (Вялікае Княства Літоўскае) за Альгерда (1341–1377).
[Нью Ёрк], 1961–1963(?). 2 с.
Канспэкт лекцыі ў праграме культурных вечароў БАЗА.

1936. **Станкевіч, Ян,** др. праф.
Навонная (вонкашняя) гісторыя Беларускага права (ягоная доля) у розных порах гісторыі Беларусі.
[Нью Ёрк], 1963. 5 с.
Канспэкт лекцыяў у праграме культурных вечароў БАЗА.
Перавыд. лекцыі з 1959 г. *гл.* Станкевіч, Ян, 1959.

1937. **Тэлефоны Беларускае Калёніі ў Кліўленд.**
Кліўленд, 1963.
Даведнік; 64 прозьвішчы.
Даведнікі неадразова перавыдаваліся ў абноўленых вэрсіях.
Сабраць усе перавыд. не ўдалося.

1938. **У адказ даношчыкам.**
[Чыкага, 1963]. 1 с.
Палеміка А. Асіпчыка з І. Касяком.

1939. **Abramchik, M.**
Belorussia.
Munich, Reprinted from the Symposium "Captive Nations in the USSR", 1963. 13 p., map.
Агляд гісторыі й палітычнага стану БССР.
*Рэц.:* "Беларус", №82, 1964.

1940. **Altrussische Urkunden:** Eine Auswahl mit Einleitung und Glossar.
Wiesbaden, Otto Harrassowitz, 1963. 122 S.
Herausgegeben von Ernst Dickenmann unter Mitarbeit von Vilma Pohl.
Скарыстаны матар'ял у старабеларускай мове.

1941. **Backus, Oswald P.**
The history of Belorussia in recent Soviet historiography.
Асобны адбітак з: "Jahrbücher für Geschichte Osteuropas", Jahrgang 11, N.F., 1963, Heft 1, S. 79–96.
Крытычны агляд савецкіх працаў пра гісторыю Беларусі.

1942. **Biełaruska-Amerykanskaje Akademickaje Tavarystva.**
[Акты, матар'ялы, адозвы 1955–1963].
[ЗША], 1963.
Папка з дакумэнтамі, друкаванымі матар'яламі таварыства, перададзеныя БІНІМу др. А. Вярбіцкім. Біяграфічныя матар'ялы пра др. Вярбіцкага. Матар'ялы апублікаваныя толькі часткова.

1943. **Byelorussian Canadian Alliance 1948 – Fifteen Year Record – 1963.**
[Toronto, The National Executive Council Byelorussian Canadian Alliance, 1963]. 8 p.
Згуртаваньне Беларусаў Канады, гісторыя арганізацыі.

1944. **Divina Liturgia Sancti Patris Nostri Ioannis Chrysostomi iuxta Ritum Byzantinum – Bielarussicum Occasione Concilii Oecumenici Vaticani II in Basilica Patriarchali Sancti Pelri Apostoli celebrata Ab Ex. mo ac Rev. mo Ceslao Sipovic...**
Roma, [1963]. 8 p.
Спэцыяльная імша.
У прадмове разглядаецца лёс беларускага каталіцкага касьцёлу й згадваюцца кс. Ф. Абрантовіч, А. Неманцэвіч, А. Станкевіч, В. Гадлеўскі.

The **Forty Fifth (45$^{th}$) Anniversary...**
*Гл.* Whiteruthenian Association of Illinois, 1963.

1945. **Institute for the Study of the USSR.**
Institute Publications (1951–1962).
Münich, 1963. 103 p.
Каталёг публікацыяў; паказьнікі прадметаў і аўтараў улучаюць і беларускія выд. Інстытуту для Вывучэньня СССР (Мюнхэн).

У рэдакцыйную раду гэтага ды інш. выд. Інстутыту ўваходзілі Павел Урбан, Алесь Марговіч, др. Станіслаў Станкевіч.

1946. **Lebedev, S.**
City of Gomel.
Washington, D.C., JPRS, 17,035, 8 Jan. 1963. 29 p.
P. 116–159: пераклад з выд.: Мінск, 1962.

1947. **Ostrowski, Wiktor.**
Confusion in English terminology.
London, Wiktor Ostrowski publisher, April 1963. 2 p.
Паходжаньне назову Беларусь і русіфікацыя.
*Гл. таксама:* Ostrowski, W., 1958, 1961, 1964, 1967.

1948. **Ostrowski, Wiktor.**
Dr. Francis Scorina the First Printer in Eastern Europe, 1516–1963.
London, 1963. 2 p.
Улётка, друкаваная да Міжнароднае Друкарскае Выстаўкі (International Printing Exhibition, Вялікабрытанія, ліпень 1963 г.).

1949. **Panucevič, V.**
Maja čytanka. Knižka pieršaja.
Chicago, 1963. 123 s.

1950. **Panucevič, Vacłaŭ.**
Paŭstańnie 1863–64 na Biełarusi = The Uprising of 1863–64 in Bielarus. Tom Pieršy.
Chicago, 1963. 40 p.
Гэта адзіны ведамы том.

1951. **Panucevič, Vacłaŭ.**
Śv. Jazafat Archijap. Połacki 1623–1963: Referat čytany na Tydni Chryścijanskaj Jednaści 19 studzienia 1963 h.
Chicago, [Biełaruskaja vydavieckaja siabrynia], 1963. 255 s.
Партрэт Язафата Кунцэвіча; літаратура.
Перавыд. кірыліцаю: Вацлаў Пануцэвіч. Сьвяты Язафат. Полацк, Сафія, 2000. 274 с. Апрацоўка М. Баўтовіча.

1952. **Panucevič, Vacłaŭ.**
Zbornik praktykavańniaŭ: dadatak da čytanak.
Chicago, Biełaruskaja Vydavieckaja Siabrynia, 1963. 20 s.

1953. **Pratest Prezydyjumu 10-ha Kanhresu Biełaruska-Amerykanskaha Zadzinočańnia ad K. Mierlaka.**
"Dziela taho što...".
New York, 12 červienia 1963. 1 s.
Канфлікт у БАЗА.

1954. **Resort Bielair-Miensk, Inc.**
Rates price-list.

Glen-Spey–New York, 1963. 4 p.
Цэньнік пакояў дому адпачынку.

1955. **Resort Belair-Miensk.**
Паведамленьне: адчыненьне 4–7 ліпеня 1963 г.
Glen-Spey, N.Y. 1 p.

1956. **Resort Belair-Miensk.**
Праект статуту.
Нью Ёрк, 1963. 2 p.
У беларускай мове.

1957. **Resort Belair-Miensk.**
Travel Directions.
Glen Spey, N.Y., 1963. 2 p.
Тры розныя ўлёткі: схема даезду. У ангельскай і беларускай мовах.

1958. **Ružaniec-Ružancovas, A.,** układalnik.
Biełaruski Zbornik i Belorussian Review, 1955–1960. Pakaźnik artykułaŭ.
[Danville, Ill.] Lithuanian Bibliographic Service, 1963. 11 s. (Lithuanian Bibliographic Service; Vydańnie №66.)

1959. **Ružaniec-Ružancovas, A.,** układalnik.
Dr. Francišak Skaryna ŭ artykułach "Lietuvių Enciklopedija", Boston, Mass., 1953–1962.
[Danville, Ill.] Lithuanian Bibliographic Service, 1963. 11 s. (Lithuanian Bibliographic Service; Vydańnie №70.)

1960. **Ružaniec, Volsa,** układalnik.
Vydańni Biełaruskaha Instytutu Navuki j Mastactva: "Zapisy" 1952–1963; "Konadni" 1954–1958; pakaźnik artykułaŭ.
Danville, Ill., Lithuanian Bibliographic Service, 1963. 11 s. (Lithuanian Bibliographic Service; Vydańnie №72.)
S. 11: Biełaruskija vydańni litoŭskaj biblijahrafičnaj słuźby:
• №26. Biełaruski Zbornik, Belarussian Review, pakaźnik, 1968.
• №27. Vieda, pakaźnik artykułaŭ, 1959.
• №37. Albaruthenica Baćkaŭščyny, 1954–1963.
• №41. Zapisy i Konadni, pakaźnik, 1961.
• №46. Matarjały dla Volnaj Biełaruskaj Encyklapedyi ŭ *Lietuvių Enciklopedija*, tom 1–5, 1961.

1961. **Statut Biełaruska-Amerykanskaha Zadzinočańnia.**
Kanstytucyja i Ustavy.
New York, зацьверджаныя X кангрэсам БАЗА 22 травеня 1963. 7 s.
Вокладка лацініцаю, тэкст кірыліцаю.

1962. **Whiteruthenian Association of Illinois.**
45 Anniversary of proclamation of Independence of Byelorussian

National Republic.
Chicago, 1963. 3 p.
На апошняй с.: How did the Byelorussian Democratic Republic come about?

1963. **Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America.**
Conference of Byelorussian organizations of the U.S. and Canada, September 1, 1963, South River, N.J.
Resolution (6 pages) mailed to UN delegations, US Congress, and US Senate.
Удзельнікі канфэрэнцыі: Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America, Byelorussian Natl. Assn. in Canada, Byelorussian-American Natl. Council of Chicago, Byelorussian-American Cultural and Relief Assn. in Cleveland, Byelorussian Liberation Front in Cleveland and in Winnipeg (Canada), United Byelorussian-American Relief Committee, Byelorussian-American Youth Assn., Byelorussian Greek-Orth. Church Committee in S. River, Chicago, Toronto, and Cleveland.

## 1964

1964. **Адважны, Вінцук.**
Князь і лапаць: Сучасная казка.
Лёндан, 1964. 25 с.
*Рэц.:* "Беларус", №88, 1964.

1965. **Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Галоўная Управа.**
"Да Беларускага Грамадзтва. Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі...".
Нью Ёрк, 15 жніўня 1964. 1 с.
Заклік узяць удзел у сустрэчы.

1966. **Беларуска-Амэрыканскі Камітэт Вэтэранаў.**
Адозва: Жаўнеры-Беларусы!
Нью Ёрк, 25 травеня 1964. 1 с.
У адзначаньне 20-годзьдзя мабілізацыі ў БКА ўстанавіць "Дзень Жаўнера".
*Дадатак:* Запросіны на азначаньне Дня Беларускага Жаўнера 4 ліпеня 1964.
*Подпісы:* К. Мерляк, А. Занковіч, Д. Клінцэвіч, У. Пеляса.

1967. **Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква, прыход Кірылы Тураўскага ў Таронце.**
Торонто, 1964. [Бп.].

Адозвы, паведамленьні, пасланьні 1955–1964, сабраныя ўладыкам Мікалаем і М. Ганько.

1968. **Беларуская мова.**
[New York], 1964. 13 с.
Канспэкт для школаў.
Укладальнікі М. Тулейка, Ю. Станкевіч, М. Кіпель.
*Гл. таксама:* Беларуская сыботняя школа ў Нью Ёрку, 1964.

1969. **Беларуская сыботняя школа ў Клыўлендзе.**
Мастацкая праграма каляднае ялінкі, 11 студзеня 1964.
Клыўленд, студзень 1964. 3 с.
Укладальніца І. Сьмірнова-Каляда.

1970. **Беларуская сыботняя школа ў Клыўлендзе пры царкве Жыровіцкае Божае Маці.**
Праграма школьнай акадэміі ў 46-тыя ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.
Клыўленд, 21-га сакавіка 1964. 2 с.

1971. **Беларуская сыботняя школа ў Клыўлендзе пры царкве Жыровіцкае Божае Маці.**
1963/1964 школьны год. Каляндар заняткаў.
Клыўленд, 1964. 4 с.

1972. **Беларуская сыботняя школа ў Нью Ёрку пры парафіі БАПЦ Сьв. Кірылы Тураўскага.**
Беларуская мова.
Бруклін, Н.Ё., 1964. 14 с.
Зборнік практыкаваньняў. Асобнымі сшыткамі выдаваліся заданьні па часьцінах мовы: назоўнік, прыметнік і г. д.
Далучаны сшытак практыкаваньняў А. Кіпель.
*Гл. таксама:* Беларуская мова, 1964.

1973. **Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва.**
Выстаўка: Пётра Мірановіч; каталёг.
Нью Ёрк, 15 сакавіка 1964. 3 с.
Выстаўка адбывалася ад 15 сакавіка да 26 красавіка.
*Гл.* "Беларус", №85–86, 1964.

1974. **Глыбінны, У.**
"Дарагі Суродзіч! Вы ведаеце, у якім становішчы апынуліся беларускія пісьменьнікі... Выйшла "На берагох пад сонцам" – цана $5".
Troy, N.Y., V. Seduro, 1964. 1 с.
Просьба падтрымаць выданьне кнігі.

1975. **Глыбінны, Уладзімер = Vladimir Hlybinny.**
На берагох пад сонцам: Апавяданьні і аповесьці = On the Shores beneath the Sun: Byelorussian stories.

Нью Ёрк–Трой, Н.Ё., выдавец: Беларуска-Амэрыканскі Літаратурна-Навуковы Цэнтр = Publisher Byelorussian-American Scientific and Literary Center, 1964. 191 с. Copyright by author.
Партрэт аўтара. Бібліяграфія працаў Уладзімера Глыбіннага замежнага пэрыяду (1944–1964).
*Рэц.:* "Беларус", №91, кастрычнік 1964; №94, студзень 1965.

1976. **[Дудка, Ул.].**
Купальле.
[Пасэйк, 1964]. 1 с.
Дапаможнік для школаў: беларускія звычаі. Выдадзена толькі для мясцовага ўжытку.

1977. **[Дудка, Ул.].**
Сёмуха.
[Пасэйк, 1964]. 1 с.
Дапаможнік для школаў: беларускія звычаі. Не друкавалася.

1978. **[Дудка, Ул.].**
Стрэчаньне Господне.
[Пасэйк, 1964]. 1 с.
Апісаньне рэлігійнага сьвята. Раздавалася вучням у школе для азнаямленьня зь беларускімі звычаямі. Не друкавалася.

1979. **Жывіца, Юры.**
Новая хата.
Troy, N.Y., выдавец: Беларуска-Амэрыканскі Навукова-Літаратурны Клюб, 1983. 95 с.
Назоў таксама ў ангельскай мове.
Бібліяграфія кніг аўтара.

3064. **[Даніловіч, Антон].**
Слоўнічак пазаслоўнікавых слоў.
[South River, N.J.], 1983. 16 с. 11 асобнікаў.
Слоўнічак абсцэннае (нецэнзурнае) лексыкі.

3065. **Дапамаговы Камітэт Жаночага Згуртаваньня ў Нью Ёрку.**
“Зварот... Надыходзяць Каляды”.

Нью Ёрк, сьнежань 1983. 2 с.
*Подпіс:* Ms. A. O. Romano.
Заклік высылаць калядныя падарункі ў Беласточчыну.

3066. **Дывэрсія Сьвятара Янкі Бруцкага.**
[Гайленд Парк, Н.Дж.], кастрычнік 1983. 2 с.
*Подпіс:* Вернікі прыходу Жыровіцкае Божае Маці БАПЦ і Гайленд Парку, штат Нью Джэрзі.
Пачатак закалоту ў БАПЦ.

3067. **Жывіца, Ю. [Ю. Попка].**
Летапіс віленскай беларускай гімназіі 1919–1944: Зборная праца. Выданьне другое, папраўленае і дапоўненае.
[Нямеччына], 1983. 49 с.
Выд. 1: 1981.

3068. **Збор дакумэнтаў Сьв. Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (на выгнаньні).**
[Аўстралія], 1983. 193 с.
Назоў таксама ў ангельскай мове з прыпіскаю: Authorized by Metropolitan Andrew. Complited by the Consistory of BAO Church.

3069. **Зварот.**
Нью Ёрк, Дапамаговы Камітэт Жаночага Згуртаваньня ў Нью Ёрку, сьнежань 1983. 1 с.
Заклік ахвяраваць на дапамогу суродзічам на Беласточчыне.

3070. **Ігнатюк, Іван.**
Прослов'я, приказкі і загадкі з Подляшшя.
Ляймен, Н.Ф.Р., видав Хведуор Жук-Попко, 1983. 18 с.

3071. **Кіпель, Вітаўт.**
Кампазытар Мікола Равенскі (1886–1953).
Grand Rapids, Mich., "Беларускі Сьвет", №42, 1983. 3 с.

3072. **Кіпель, Вітаўт.**
Язэп Лёсік (1884–1984).
Grand Rapids, Mich., "Беларускі Сьвет", №43, 1983. 4 с.

3073. **Магутны Божа.**
Беларускі Рэлігійны Гімн. Музыка М. Равенскага, словы Н. Арсеньневай.
Грэнд Рэпідс, ЗША, перавыданьне Міколы Прускага, 1983.
Ноты; словы кірыліцаю й лацініцаю. На каляровай паперы, на старонках – стылізаваныя асады з нацыянальным арнамэнтам.
Выд. 1: 1947.
*Гл. таксама:* Арсеньнева, 1983.

3074. **[Манькоўскі, Пётра].**
"А гэта мой прыватны ліст да сп. Мацукевіча з Таронта...".

[ЗША], 12/IX/1983. 1 с.
Закалот у БАПЦ.

3075. **[Манькоўскі...].**
Пакорны служка Сатаны [ліст да сп. Мацукевіча...].
[Нью Ёрк], 17/XII/1983.
Лаянка ў адрас епіскапа Мікалая. Закалот у БАПЦ.

3076. **Мікалай,** Архіяпіскап, Першы Герарх БАПЦ.
Архіпастырскі ліст.
Канада, 31 травеня 1983. 1 с.
Пра сьмерць мітрапаліта Андрэя.

3077. **Народниї письні з Подляшшя в записах Івана Ігнатюка.**
Ляймен, видав Хведуор Жук-Попко, 1983.
Часть I – Обрадові письні: весільниї, похоронниї, колядкі й щедрівкі, обжинковиї, веснянкі.
Часть II – Кавалірськії письні: рекрутськії письні, солдатськії письні, партизаньскії письні, кавалірськії (козацькії) письні, чумацькії письні (1984).
Часть III (Уступ. Люблін 22.01.1985) – Любовнії письні.
Часть IV (Уступ. Люблін 3.04.1985) – Родинно-побутовиї письні.
Часть V (липень 1985) – Балади й гісторичнії письні. Уключае слоўнік дыялектных слоў; сьпісак інфарматараў, ад якіх запісаныя песьні; ноты; мапа; ілюстрацыі.
Часті III, IV, V видав власним коштом Юрій Попко.
Часть VI – Жартовливиї письні. Ляймен, Західня Нимеччина, 1987.
*Рэц.:* "The Slavonic and East European Review", no. 62(3), 1984.

3078. **Памятка высьвячэньня Царквы Сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 30 кастрычніка 1983 г. = Commemorating the Consecration of St. Cyril of Turov American-Byelorussian Greek Orthodox Church in Richmond Hill, New York, October 30, 1983.**
Нью Ёрк, 1983. 16 с.
Сьпісы сьвятароў, якія былі настаяцелямі, і ахвярадаўцаў.
У беларускай і ангельскай мовах.

3079. **Пасланьне Сабору Епіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Царквы.**
[ЗША], Лета Божага 1983, месяца Сакавіка 5-га дня. 2 с.
*Подпісы:* мітрапаліт Андрэй, епіскап Ізяслаў.

3080. **Перадсаборная камісія Надзвычайнага Сабору БАПЦ.**
Дораты, Н.Дж., 3 красавіка 1983. 2 с.
*Подпісы:* мітрафорны прат. а. Карп Стар., Васіль Русак.

3081. **Пратакол Надзвычайнага Сабору Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, які адбыўся 28–30 травеня 1983 г. у Кліўленд, Агаё.**

[Кліўлэнд], 1983. 8 с.
*Гл. таксама:* БАПЦ, 1983.

3082. **Пятроўскі, Ян.**
Клясычны Грэцка-Беларускі слоўнік. Нанава апрацаваны.
Частка 1: літары А–М.
[Gainesville], Published by Byelorussian Charitable Educational Fund, 1983. 290 с.
Суправаджальны ліст ("Пачынаем рассылаць...") датаваны 23.03.1984.
Частка 2: 1985.

3083. **Пятроўскі, Ян.**
У справе клясычнага Грэцка-Беларускага Слоўніка. Да ўсіх суродзічаў Беларускіх Супольнасьцяў...
Гэйнсвільл, Флярыда, у верасьні 1983. 4 с.

3084. **Рада Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў Вялікай Брытаніі.**
"Пастанова... астаемся вернымі мітрапаліту Андрэю...".
Манчэстэр, 25.4.1983. 1 с.

3085. **Спасеньне, пэўнасьць і радасьць.**
Atlanta, Ga., 1983. 24 с.
Выданьне Беларускага Эвангельска-Баптысцкага Брацтва.
Філязофія пратэстанцтва.
*Гл.* "Беларус", №312, 1983.
*Гл. таксама:* Спасеньне..., 1970, 1977.

3086. **Тарасэвіч, Уладзімер,** Біскуп.
"Дарагія ў Хрысьце Браты і Сёстры... Словамі Анёлаў...".
Чыкага, 25 сьнежня 1983.
Каляднае пасланьне.

**Ярмалковіч, Віктар.**
*Гл.* В[іктар] Я[рмалковіч], 1983.

3087. The **Anglo-Byelorussian Society.**
Lecture course on Byelorussian culture. Academic year 1982–1983.
London, 1983. 2 p.
Праграма 17-га штогадовага сэмінару, прысьвечанага беларускай культуры.

3088. **Anthologie de Nouvelles Biélorusses.**
Dix-neuf auteurs.
Sherbrooke (Québec, Canada), Editions Naaman, 1983. 216 p.
Анталёгія апавяданьняў. Уступ Івана Навуменкі. Пад наглядам і ў супрацоўніцтве БССР і ЮНЭСКО.

3089. **Belorussian Canadian Alliance = Згуртаваньне Беларусаў Канады.**
Thirty Five Years.
Toronto, Belorussian Canadian Alliance, 28.10.1983. 5 p.
Гісторыя арганізацыі за 35 гадоў.

3090. **Blum, Jakub** and **Vera Rich.**
The image of the Jew in Soviet Literature.
New York, KTAV (for the Institute of Jewish Affairs, London), 1985. 276 p.
Аналіз партрэта габрая ў савецкай літаратуры. Аўтарка Вера Рыч прысьвяціла палову кнігі (с. 100–271) разгляду "габрайскае тэмы й габрайскіх партрэтаў" у беларускай савецкай літаратуры. Гэтая частка кнігі выйшла таксама асобным адбіткам: Jewish themes and characters in Belorussian texts.
*Рэц.:* "Soviet Jewish Affairs", 1986, vol. 16(2), p. 79–82; "Nationalities Papers", Toronto, Fall 1985, vol. XIII, no. 2, p. 284–286; "Беларус", №327, 1985.

3091. **Byelorussia, land and people.**
Adelaide, Byelorussian Association in S.A., Inc., 1983. 23 p.
Агульная інфармацыя пра Беларусь для Аўстралійскай энцыклятэдыі.

3092. **Byelorussian Cultural Tradition in America.**
Symposium – Rutgers the State University, April 23, 1983.
Exhibit, April 23 – June 23, 1983.
New Brunswick, N.J., Rutgers the State University, April 23, 1983. 17 p.
Праграма канфэрэнцыі, прысьвечанай беларусам у ЗША. У ангельскай мове.
Выстаўка багата экспанаваная. Арганізатар канфэрэнцыі й выстаўкі Галіна Русак.
*Гл.* "Беларус", №310, 1983.

3093. **Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Inc.**
Publications of the Institute and books available through the Institute.
New York, 1983. 22 p.
Сьпіс кніг і выданьняў, якія можна набыць праз БІНІМ.
*Гл. таксама:* Byelorussian Institute..., 1978, 1979, 1982, 1985.

3094. **Byelorussian Liberation Front.**
Paneuropa – Union.
Mainz, Europa Tage, 7–9 Oct. 1983. 2 p.
Прамова Дз. Касмовіча. Асноўныя ідэя: Беларусь павінна быць часткай Эўропы. У нямецкай мове.

3095. **Byelorussian Liberation Front.**
Statement of the Byelorussian Liberation Front at the 16th World

Anti-Communist League Conference in Luxemburg, Sept, 19–23, 1983. 9 p.
• Joint Communique, 16th Conference... Sept. 22, 1983. 2 p.
• Resolution on the Independence of Byelorussia... Sept. 20–22, 1983. 2 p.
Палітычныя матар'ялы для раздачы дэлегатам на канфэрэнцыі; сшытыя разам. Асноўная ідэя: БССР як дзяржава – фікцыя, БССР – калёнія Расеі.

**Byelorussians in Bergen County, N.J.**
*Гл.* Kipel, Vitaut and Zora Kipel, Byelorussians..., 1983

3096. **Captive Nations Committee, Inc.**
25th Anniversary Journal 1959–1983.
New York, Captive Nations Committee, NY, 1983. [Бп.].
Артыкул пра Беларусь як паняволеную краіну. Аўтар В. Кіпель.
Былі зробленыя адбіткі.

3097. **Episcopal Ordination of the Most Reverend...**
Testimonial banquet on the occasion...
Chicago, Il., Sept. 8, 1983. 4 p.
Банкет у гонар біскупа Ў. Тарасэвіча.

3098. **Episcopal Ordination of the Most Reverend Vladimir Tarasevitch, O.S.B., D.D.**
Chicago, Il., Sept. 8, 1983. 28 p.
Урачыстасьць хіратоніі біскупа Ў. Тарасэвіча.
*Гл.* "Беларус", №313, 1983.

3099. **Kalandar "Viechaŭ" na 1984 hod.**
Apracavaŭ Jury Popko.
Leimen, 1983. 1 аркуш.
У правым верхнім куце – Пагоня.

3100. **Kipel, Vitaut** and **Zora Kipel.**
Byelorussian-American Theatre.
Адбітак з: Ethnic Theatre in the United States; Edited by Maxine Schwartz Seller. Westport, CT, Greenwood Press, 1983. 606 p., p. 67–100.
Праца пра беларускі тэатар у ЗША, распаўсюджвалася асобнаю брашураю.
*Гл. таксама:* "Беларус", №315, 1984.

3101. **Kipel, Vitaut** and **Zora Kipel.**
Byelorussians in Bergen County, N.J.: A short description.
Paramus, N.J., The Bergen Community Museum, 1983. 2 p.
Інфармацыя, падрыхтаваная ў зьвязку з 200-годзьдзем павету

Бэрген (Нью Джэрзі). Пасяленьне беларусаў у гэтай акрузе.
*Гл. таксама:* "Беларус", №310, 1983.

3102. **Kipel, Zora.**
Byelorussian Collections in North America.
New York, NYPL, 1983. 9 p. 25 асобнікаў.
Як прадстаўнік Нью-Ёрскае Публічнае Бібліятэкі, З. Кіпель чытала даклад пра беларускія кнігазборы ў бібліятэках Паўночнай Амэрыкі, які раздаваўся на Кангрэсе Славянаведаў Амэрыкі ў Нью Арлеане (Люізіяна).

3103. **Kit, Boris.**
Antoni Zygmund. Sein Leben und sein Beitrag zu der Entwicklung der Mathematik in 20. Jahrhundert.
Inaugural – Dissertation zur Erlangung des Doktorgrades (Dr.Phil.) Universität Regensburg 1980, publ. 1983. 153 p., Appendix: Ubenslauf, bibliographs.
Доктарская дысэртацыя.

3104. **Kudrawez, A.**
Totengedenken.
Berlin, 1983.

3105. **Kukobaka, Mikhail.**
Byelorussian worker imprisoned in the Soviet Union for defending Human Rights.
London, Amnesty International, 1983. 4 p.
Updated version, October 1985.
Дзейнасьць беларускага дысыдэнта М. Кукабакі.
*Гл. таксама:* "Беларускі калекцыянер", Мінск, 2(9) ліпеня 1993.

3106. **Loftus, John.**
The Belarus Secret.
Edited by Nathan Miller.
New York, Penguin Books Ltd., 1983. 225 p. Малы фармат.
Перавыд. з: Loftus, 1982.

3107. The **Most Rev. Metropolitan Andrew Primate of the Byelorussian Autocephalic Orthodox Church.**
"Архіпастырскае распараджэньне... архіяпіскап Мікалай пазбаўлены япіскапскага сану... забараняецца прымаць удзел у скліканьні «сабору»".
Cleveland, 6 лютага 1983. 1 р., суправаджальны ліст.
Закалот у БАПЦ.

3108. **Neureiter, Ferdinand.**
Weissrussische Anthologie. Ein Lesebuch zur weissrussischen Literatur (mit deutschen Übersetzungen).

München, Verlag Otto Sagner, 1983. 230 S. (Slavistische Beiträge; Band 162.)
Нямецкія пераклады беларускае літаратуры.
Ведамыя два фарматы выд.

3109. [**Pauke, Bahdan**].
Bielarus/Weissruthenia 1915–1923: Outline of Postal Entities on the Territory of Bielarus.
[Chicago], 1983. [Бп.].
Альбом. Рэпрадукцыі марак, якія выкарыстоўваліся на тэрыторыі Беларусі ў 1915–1923 гг.

3110. [**Seduro–Hlybinny–Седуро, Вл.**].
Бібліяграфія працаў розных пэрыядаў, у розных мовах.
Troy, N.Y., [1983]. Машынапіс.
Папраўкі, дапісы Ірэны Сядуры.

3111. **Sgambati, Emanuela.**
Il Tristano biancorusso.
Firenze, Casa editrice lettere; Licosa commussionaria sansoni, 1983. 509 p. (Studia historica et philologica; XV; Sectio slavoromanica; 4.)

3112. The **Sixty Fifth (65$^{th}$) Anniversary of the Declaration of Independence of Bielarus March 25 – 1918–1983.**
Chicago, March 27, 1983. 4 p.
Праграма.

3113. **St. George Byelorussian Orthodox Church.**
Byelorussian Council of Orthodox Churches in America, Ecumenical Patriarchate 1958–1983.
[Chicago], November 1983. 8 p.
Дзейнасьць гэтага прыходу, як і інш. беларускіх прыходаў, у юрысдыкцыі канстанцінопальскага патрыярха.

3114. **Statute of the Byelorussian Autocephalous Orthodox Church.**
New Brunswick, N.J., 1983. 23 p.
Статут БАПЦ. Перадрук з выд. 1979.

3115. **Ščećka, Vasil.**
Ansambl Biełaruskich Studentaŭ, Prafesar Mikoła Ravienski ŭ Luven...
New York, 27.IV.1983. 7 s. Некалькі асобнікаў.
Дзёньнік В. Шчэцькі з часоў Лювэну.

3116. **United Nations, Postal Administration.**
[Byelorussian series].
New York, UN, September 1983.
Беларуская марка ў сэрыі сьцягоў дзяржаваў – сябраў ААН.
*Гл.* "Беларус", №315, 1984.

3117. **Zimmer, Szczepan K.**
The beginning of Cyrillic printing in Cracow, 1491. From the Orthodox past in Poland.
New York, Columbia University Press, 1983. 292 p.
Пачатак кірылічнага друку ў Кракаве. Шмат беларускіх матар'ялаў з працаў др. В. Тумаша. Падзякі А. Надсону й З. Кіпель.
Шчэпан Зымэр быў ганаровым сябрам БІНІМу.
*Гл.* "Беларус", №311, 1983.

## 1984

3118. **Ад Кансысторыі БАПЦ.**
Камунікат.
[Манчэстэр, Англія], 1984. 1 с.
"Пастановай 3-га Звычайнага Сабору БАПЦ 26, 27, 28 травеня 1984 г. у Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве... зацьверджаньне Яго Высокапрэасьвяшчэнства Архіепіскапа Ізяслава на становішча Першагерарха БАПЦ з наданьнем яму тытулу Мітрапаліта...".
Таксама далучаная "Рэзалюцыя 3-га Звычайнага Сабору БАПЦ".

3119. **Акула, Кастусь.**
Усякая ўсячына: Проза, паэзія, п'еса.
Таронта, выданьне "Пагоні", 1984. 136 с.
Прадмова выдавецтва "Пагоня".
На адвароце тытула: "Potpourri" – prose, poetry, play.

3120. **Архіпастырскае пасланьне...**
Архіепіскап Ізяслаў.
Нью Ёрк, 5 лютага 1984. 2 с.

3121. **[Асіпчык, А.].**
Я Сьвятло Сьвету. Сьвятыя Беларускага Народу.
Нью Брансвік, Н.Дж., выданьне Беларускага Праваслаўнага Жыровіцкага Брацтва на Чужыне, 1984. 54 с.
У гонар Тысячагодзьдзя Хрышчэньня Беларусаў 988–1988.

3122. **Астроўскія, Радаслаў і Віктар.**
Беларусь у X– XVI ст., гістарычны нарыс.
Ляймэн, Нямеччына, 1984. 54 с.

3123. **Беларускае Культурна-Мастацкае й Навуковае Таварыства ў Саўт Рывэры, Н.Дж.**
Каталёг мастацкай выстаўкі (11-й).
Саўт Рывэр, Н.Дж., 1984. 4 с.
*Гл.* "Беларус", №317, 1984.

3124. **Беларуская А.П. Царква ў Паўдзённай Аўстраліі.**
"Моцна паважанаму духавенству...".
Hindmarch, South Australia, 2.4.1984. 3 с.
Пра патрэбу згоды ў БАПЦ.
*Подпіс:* К. Станкевіч.

3125. **Беларуская Каталіцкая Царква Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла.**
Службы Нядзельныя.
Лёндан, 1984. 17 с.
Пераклад а. А. Надсона.

3126. **Беларускі царкоўны сьпеўнік.**
London, Беларуская Грэка-Каталіцкая (Вуніяцкая) Царква Сьв. Пятра і Паўла, 1984. 10 с.
Рэдактар Г. Пікарда.

3127. **Белямук, Міхась.**
Др. Ю. Штыхаў.
USA, Cleveland, 1984. 14 с.
Біяграфія Ю. Штыхава й храналягічны (да 1981 г.) сьпіс ягоных працаў.
Адбітак з: "Беларускі Сьвет", 1984.

3128. **Вялікі, Павал, Мітрафорны Пратаярэй.**
Апостальскія чытаньні ўва ўсе нядзелі году і на сьвяты.
[Toronto–South River], Byelorussian Press of U.A.B.R.C., 1984. 47 с.

3129. **В[іктар] Я[рмалковіч].**
Вільня: Кароткі гістарычны нарыс.
[Зах. Нямеччына], 1984. 33 с.
С. 31–32: бібліяграфія беларускіх друкаў у Вільні за 1906–1940 гг.

3130. **Жывіца, Юры.**
Радаслаў Астроўскі – прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады. Ягонае жыцьцё, праца і змаганьне.
[Нямеччына], выдавецтва "Вехі", 1984. 104 с. Выд. 2, папраўленае і дапоўненае.
Выд. 1: 1964.

3131. **Запрудник, Ян.**
Антон Луцкевич (Новина). (К столетию со дня рождения.)
БАЗА, 1984.
Асобны адбітак з: "Проблемы Восточной Европы", Нью-Йорк, 1984, №9–10, с. 271–272.
Разам адбіта: Антонъ Новина. Бѣлорусы, з: Формы національнаго движенія въ современныхъ государствахъ / Под ред. А. И. Костелянскаго. С.-Петербургъ, 1910, с. 383–395.

3132. **Золак, Янка.**
Віталія: Фантастычная аповесьць.
[South River, N.J.], выдавецтва “Адгук”, 1984. 44 с. Частка першая.

3133. **Калубовіч, Аўген.**
Мікола Шчаглоў (Куліковіч). Памяці сябры ў 15-я ўгодкі сьмерці.
Grand Rapids, Mich., “Беларускі Сьвет”, №44, 1984. 10 с.

3134. **Каляндар на 1984 год.**
Нью Ёрк, БАЗА, 1984. 1 с.
Пазначаныя большыя беларускія нацыянальныя сьвяты.

3135. **Каляндар культурна-палітычных угодкаў на 1984 г.**
Нью Ёрк, “Беларус”, 1984. Вялікі (газэтны) фармат.
Дадатак да газэты “Беларус”, №315, студзень 1984.
Укладальнікі Ян Запруднік і Міхась Тулейка.
Партрэты К. Каліноўскага й А. Луцкевіча.

3136. **Карповіч, Алесь.**
Памяці Міколы Шчаглова (Куліковіча).
Grand Rapids, Mich., “Беларускі Сьвет”, №44, 1984. 3 с.

3137. **Касмовіч, Д.**
Беларускія студэнты ў Бэльгіі і ў Вольным Сьвеце перад Другой Сусьветнай Вайной.
Штутгарт, 1 верасьня 1984. 8 с. 50 асобнікаў.
Рэфэрат Д. Касмовіча на канфэрэнцыі БІНІМу (Кліўлэнд, верасень 1984).

3138. **Манькоўскі, Пётра.**
Заходняя царква і беларусы: Ідэйна-гістарычны агляд суадносін.
Рэфэрат, чытаны на III Саборы Б.А.П.Ц. у Манчэстэры, Англія, дня 27/V/1984.
[Нью Ёрк], 1984. 12 с.

3139. **Манькоўскі, Пётра.**
У час трывогі.
[Нью Ёрк], 1984(?). 2 с.
Палемічны ліст-адозва: закалот у БАПЦ.

3140. **Мірановіч, Антось = Mironowicz, Antoni.**
Супрасьль – буйны цэнтр культуры і рэлігіі ў XVI ст. = Suprasl jako ośrodek kulturno-religijny w XVI wieku.
Leimen–St. Ilgen, Byelorussisches Museum, 1984. 105 с.
Тэкст у польскай мове.

3141. **Народниї письні з Подляшшя в записах Івана Ігнатюка.**
Часть II – 1984.
*Гл. таксама:* Народниї..., 1983; Ігнатюк, 1985; Народниї..., 1987.

3142. **Носович, И. И.**
Словарь белорусского наречия.
München, O. Sagner, 1984–1986. In 2 Bänden.
Перавыд. з: И. И. Носовичъ, 1870.
Пасьляслоўе G. Freidhof i P. Kosta.
*Рэц.:* "The Slavonic and East European Review", no. 4, October 1987; "Беларус", №343, 1988.

3143. **Панькоў, Мікола.**
Хроніка беларускага жыцьця на Чужыне.
[Нью Ёрк], 1984. 168 с.
Рукапіс адрэдагаваў і надрукаваў на машынцы Васіль Шчэцька.
Кніжнае выд.: Мікола Панькоў. Хроніка беларускага жыцьця на Чужыне (1945–1984). Мінск, 2001. (Бібліятэка часопіса "Беларускі Гістарычны Агляд"; Сэрыя: Матар'ялы да беларускай гісторыі; 7.)

3144. **Праваслаўная царква ў Беластоцкім краі і беларуская мова ў ёй.**
Роздумы.
Нью Ёрк, выдавецтва "Беларус", 1984. 33 с.
Далучаны таксама сьпіс выданьняў газэты "Беларус".
*Рэц.:* "The Journal of Byelorussian Studies", London, 1887, vol. 5, no. 3–4, p. 80–81.

3145. **Ролсон, Янка.**
З глыбінь мінулага.
Адэляйда, Аўстралія, 1984. 80 с.
Біяграфічныя ўспаміны з жыцьця ў СССР.
*Гл. таксама:* "Беларус", №411, 1994.

3146. **Старажоўскі, К.**
Уладзімер Сядура-Глыбінны.
Grand Rapids, Mich., "Беларускі Сьвет", №45, 1984. 10 с.
Бібліяграфія працаў Ул. Сядуры-Глыбіннага замежнага пэрыяду, 1965–1983.

3147. **Хрептович-Бутенева, О. А.**
Перелом (1939–1942).
Париж, YMCA-Press, 1984. 5+233 с.
Пра падзеі ў Заходняй Беларусі. Аўтарка – дачка праваслаўнага сьвятара Апалінара Храптовіча-Буцянёва (нашчадка графскага роду), які пераехаў зь сям'ёю з Францыі ў Заходнюю Беларусь у 1935 г., а ў 1939 г. быў арыштаваны саветамі.

3148. **Цярпіцкі, Віталі.**
Гісторыя пабудовы Беларускае Праваслаўнае Царквы імя Сьв. Еўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рывэры, Нью Джэрсі.

Саўт Рывэр, 1984. [Кожная частка кнігі мае асобную пагінацыю]. Частка I. С. 1–13: справаздача Ўл. Брылеўскага. Ілюстрацыі (1–7). Частка II. "Другая частка... будзе ахопліваць храналягічны працэс пабудовы кожнага году" (ад аўтара). 1967–1968: 24 с.; 1969: 8 с.; 1970: 10 с.; 1971: 7 с.; 1972: 28 с. Апошні разьдзел (8 с.) – паэма Міхася Кавыля, прысьвечаная царкве: 1972–1984.
Выд. 2: 1994.

3149. **Шнэк, У.**
Беларуская Краёвая Абарона: Уніформа і адзнакі (1944–1984). [Аўстралія–Нямеччына], выданьне Беларускага Вызвольнага Фронту, [1984]. 75 с.
Каляровы альбом, выдадзены ў гонар 40-х угодкаў стварэньня Беларускае Краёвае Абароны (1944–1984). Спэцыфікацыі радоў войскаў БКА. "Альбом апрацаваны на падставе праекту, распрацаванага пад кіраўніцтвам Ген. К. Езавітава". Касмовіч, 4/XII/86. Уступ Д. Касмовіча й У. Шнэкам. У ангельскай і беларускай мовах.

**Ярмалковіч, В.**
*Гл.* В[іктар] Я[рмалковіч], 1984.

3150. **Amnesty International.**
Mikhail Kukobaka.
London, 1984. 4 p.
Інфармацыя міжнароднай праваабарончай арганізацыі Amnesty International пра беларускага дысыдэнта М. Кукабаку.
Перавыд. з дадаткамі: *гл.* Kukobaka, 1985.

3151. **Byelorussian American Association, Inc. and Byelorussian Canadian Alliance.**
"Cordially invite you to participate in the 16th Biennial Convention... of Byelorussians September 1–3, 1984".
Cleveland–Strongsville, Ohio, 1984. 4 p.
Запросіны й праграма 16-е Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі.

3152. **Bykau, W.**
Zeichen des Unheils.
Berlin, 1984.

3153. An **evening with Byelorussian writers.**
Program of an on-going lecture series: Evening with Ryhor Baradulin.
Flushing, N.Y., Queens College, CUNY, October 1984, 4 p.
Пачынаючы з 1970-х гг., Куінсаўскі Каледж Гарадзкога Ўнівэрсытэту ў Нью Ёрку ладзіць літаратурныя вечарыны беларускіх пісьменьнікаў. На вечарынах у розныя гады выступалі: А. Баршчэўскі, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, В. Адамчык, І. Чыгрынаў, Алесь

Адамовіч, В. Казько, А. Мальдзіс, Дж. Дынглі, В. Грыцкевіч, дыплямат П. Краўчанка. Праграмы вечароў часам друкаваліся.

3154. **Grimsted, Patricia Kennedy.**
The "Lithuanian Metrica" in Moscow and Warsaw: reconstructing the archives of the Grand Duchy of Lithuania: Including an annotated edition of the 1887 Inventory compiled by St. Ptaszycki / P. Grimsted-K., with the collaboration of Irena Sulkowska-Kurasiowa.
Cambridge, Mass., the Harvard Ukr. Res. Inst., 1984. 483 p.
Збор дакумэнтаў да гісторыі Беларусі ў ВКЛ.

3155. **Janovič, Sakrat.**
Miniatures.
London, The Anglo-Byelorussian Society, 1984. 91 p.
Edited and translated by Shirin Akiner.
*Рэц.:* "The Journal of Byelorussian Studies", London, 1988, vol. 6, no. 1, p. 72–73.
*Гл. таксама:* Janovič, 1997.

3156. [**Melianovich, Vasil,** complier].
Which country doesn't hear VOA? Byelorussia.
Upperco, Maryland, 1984. [Бп.], [~200 p.].
Агляд спробаў беларусаў дамагчыся ўвядзеньня беларускае мовы ў праграмы радыёстанцыі "Голас Амэрыкі".

3157. **Naoumenko, Ivan.**
Yanka Koupala et Yakoub Kolass poétes Biélorusses.
Traduit par Iréne Sokologorsky et Claude Frioux.
Paris, Messidor / Temps Actuels, 1984. 160 p.
Манаграфія. Савецкі пункт гледжаньня на творчасьць Я. Купалы й Я. Коласа.

3158. The **New York Public Library.**
Censorship in the Slavic World. An exhibition in the NYPL, June 1 – October 15, 1984. 24 p.
Былі выстаўленыя беларускія матар'ялы: "Тэстамэнт" Уладзімера Жылкі, сцэнзураваныя творы Янкі Купалы, царская цэнзура твораў Францішка Багушэвіча.

3159. The **Rite of Betrohal and the Sacrament of Crowning or of Marriage.**
Brooklyn, St. Cyril's of Turau Brotherhood and Sisterhood of the Translation and commentary by V. Rev. Vladimir S. Borichevsky.
Byelorussian Autocephalous Orthodox Church, 1984. 18 p.
Выд. з нагоды шлюбу Л. Данілюк і D. J. Fisher.

3160. **Siekierski, Maciej Mikolaj.**
Landed wealth in the Grand Duchy of Lithuania: The economic affairs of prince Nicholas Christopher Radziwiłł, 1549–1616.

Berkeley, 1984. III+404 p.
Дысэртацыя.

3161. **Slavic New York [даведнік].**
New York, Baruch College of the City University of New York, 1984. 24 p.
Інфармацыя пра беларускія арганізацыі й друкі Нью Ёрку.
Адна з укладальнікаў даведніка – З. Кіпель.

3162. A **Small Anthology of the Poetry of Ryhor Baradulin.**
New York, Queens College City University of New York, 1984. 10 p.
Assembled on the occasion of the visit of Ryhor Baradulin to the City University of New York, October 23, 1984.
*Гл. таксама:* An evening..., 1984.

3163. [**Tarasevitch, Vladimir,** Most Reverend].
Apostolic Visitor for Byelorussias. "Some information about the Christian Unity Week...".
Chicago, Il., Sunday January 22, 1984. 2 p.

3164. **Telephones of Byelorussian Community in Cleveland = Тэлефоны беларускае калёніі ў Кліўлэнд.**
[Cleveland], 1984. 8 p.
Тэлефонны даведнік.

## 1985

3165. **Акафіст за ўпакой Памершых.**
[Нью Брансуік, Н.Дж.], выдавецтва М. Прускага для ўжытку БАПЦ, 1985. 17 с.
Пераклаў Міхась Міцкевіч. Рэдагаваў а. Аляксандр Яноўскі.

3166. **Беларускае Культурна-Мастацкае й Навуковае Таварыства ў Саўт Рывэры, Н.Дж.**
Каталёг выстаўкі (12-й) мастакоў і ўмельцаў.
Саўт Рывэр, Н.Дж., 1985. 4 с.

3167. **Беларуская Каталіцкая Царква Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла.**
Боская Літургія між сьвятымі Айца Нашага Яна Залатавуснага.
Лёндан, 1985. 62 с.
Пераклад а. А. Надсона.
*Гл. таксама:* Боская..., 1985.

3168. **Белямук, Міхась.**
["Беларускі Голас". С. Хмару].
Cleveland, 12 сьнежня 1985. [Бп].
Палеміка з выдаўцом газэты "Беларускі Голас" С. Сіняком (Хмарам) у справе епіскапа Ізяслава.

3169. **Бембель, Алег.**
Роднае Слова і маральна-эстэтычны прагрэс.
Лёндан, The Association of Byelorussians in Great Britain, 1985. 242 с.
*Рэц.:* "Беларус", №328, 1986; "The Slavonic Review", 1987, vol. 65(3), p. 433–434.

3170. **Боская Літургія між сьвятымі Айца Нашага Яна Златавуснага.**
Лёндан, Беларуская Каталіцкая Царква Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла, 1985. 62 с. Выд. 2.
Беларускі пераклад архімандрыта Аляксандра Надсона.
Выд. 1: 1983; Выд. 3: 1993. Выд. 1 і 2 – супольныя для сьвятароў і вернікаў.
*Гл. таксама:* Беларуская Каталіцкая Царква..., 1985.

3171. **Гурток "Васількі" Беларускай Незалежніцкай Думкі ў Англіі.**
"Дарагія суродзічы...".
Брадфорд, лістапад 1985. 1 с.
Паведамленьне-адозва пра першы літаратурны сшытак, прысьвечаны Слуцкаму паўстаньню.
*Гл. таксама:* Сшытак..., 1985.

3172. **Гурток "Васількі" Беларускай Незалежніцкай Думкі ў Англіі.**
Запросіны...
Брадфорд, лістапад 1985. 1 с.

3173. **Даніловіч, Антон.**
Падкашнічак: З нататак пра мову. Сшытак першы.
ЗША, выдавецтва "Адгук", 1985. 16 с.

3174. **Дапамога беларусам на Беласточчыне і ў Польшчы.**
Нью Ёрк, студзень 1985. 1 с.
Адозва. Суправаджальныя лісты да арганізацыяў і да індывідуальных асобаў.

3175. **Дарагія суродзічы і прыяцелі!**
"З прычыны надыходзячых Калядных Сьвятаў...".
Gainesville, Fla., Каляды 1985. 2 с.
*Подпіс:* Ян Пятроўскі.

3176. **Жывіца, Ю. [Ю. Попка].**
Беларусь: Кароткі гістарычны агляд.
[Нямеччына], "Вехі", 1985. 13 с. Выд. 2.
Выд. 1: 1979.

3177. **Змагар, Алесь.**
Мае ўспаміны.
ЗША, выдавецтва Беларускага Вызвольнага Руху, 1985. 128 с.
Манускрыпт. Перахоўваецца ў зборы Лявона Юрэвіча.

3178. **Ігнатюк, Іван.**
Кукання зозуль (Zbiórek wierczy na prawach rękopisu).
Люблін, 1985; Ляймен, Ф.Н.Р., 1985. 98 с.
"Власним коштом на ксерографі Хвядор Жук".

3179. **Ігнатюк, Іван,** зьбіральнік.
Народниї письні з Подляшшя. Часть III: любовниї письні.
Ляймэн, выдавец Юры Попко, 1985. 69 с.
*Гл. таксама:* Народниї..., 1983, 1984, 1987.

3180. **Ігнатюк, Іван,** зьбіральнік.
Народниї письні з Подляшшя. Часть IV: родинно-побутовиї письні.
Ляймэн, выдавец Юры Попко, 1985. 64 с.

**Калбаса, Янка.**
*Гл.* Сшытак..., 1985.

3181. **Калоша, К.**
У вялікую сыботу вечарам. Палуначніца.
[Кліўлэнд, 1985. 14 с.].
Словы й ноты.

3182. **Калубовіч, Аўген.**
"Айцы" БССР і іхны лёс.
Клыўленд, 1985. 80 с. Выд. 2.
Тытул і рэзюмэ (V. Kipel) у ангельскай мове.
Перавыд.: На крыжовай дарозе. Менск, "Бацькаўшчына", 1994. 316 с. Улучае таксама: "Айцы БССР", "Акт 25 Сакавіка".
*Гл. таксама:* Калубовіч, 1982, 1988.

3183. **Каляндар палітычна-культурных угодкаў на 1985 год.**
Нью Ёрк, "Беларус", 1985. Газэтны фармат.
Укладальнік Ян Запруднік.
Каляндар прысьвечаны скарынаўскаму году.
*Гл.* "Беларус", №325, 1985.

3184. **Кіпель, Вітаўт і Зора,** укладальнікі = Kipel, Vitaut and Zora, compiled by.
Янка Купала й Якуб Колас на Захадзе: Бібліяграфія = Janka Kuala and Jakub Kolas in the West: Bibliography.
Нью Ёрк, БІНІМ, 1985. X+351 с. (Bibliographic Series; No. 1.)
Уступ у беларускай і ангельскай мовах.
*Рэц.:* "Беларус", №328, 1986; №333, 1987; "Canadian Slavonic Papers", June 1986, XXVIII (2); "Сучасність", Нью-Йорк, червень 1986, №5, с. 119; "The Slavonic and East European Review", Winter 1986; "The Library", the Transactions of the Bibliographical Society, Oxford, December 1986; "ICSEES International News Letter", Paris,

May 1986, no. 22; “Nationalities Papers”, Kent, Ohio, Spring–Fall 1986, p. 115–116; “Континент”, №49, 1986, с. 419–420; “Новое Русское Слово”, Нью Йорк, 11 января 1986; “Весткі й паведамленьні”, Нью Ёрк, №86, 1986; “Зважай”, Торонто, №42, чэрвень 1986.

3185. **Літургія на Благавешчаньне Багародзіцы...**
Пачынаецца вячэрняй.
[Кліўлэнд, 1985. 18 с.].
Апошняя с.: Saint Mary's annunciation.
Словы й ноты. Апрацаваў К. Калоша.

3186. **Мала антологія білоруської поезії у перекладах Леоніда Полтави.**
Адбітак з: “Визвольний Шлях”, Лондон, 1985, №10, с. 1198–1213; №11, с. 1374–1384; №12, с. 1485–1491.
БІНІМ, 1985. 35 с. Ксэрограф; 20 асобнікаў.
Уступ да анталёгіі (1982); аўтар Л. Палтава.
Украінскія пераклады вершаў Н. Арсеньневай, М. Багдановіча, А. Барскага, А. Вярцінскага, Л. Геніюш, В. Іпатавай, Я. Коласа, Я. Купалы, А. Малюка, А. Салаўя, Я. Сіпакова, М. Сяднёва, М. Танка, Р. Тармолы, Я. Юхнаўца.

**Мітрафорнаму Протаерэю Аляксандру Надсану...**
*Гл.* Тарасэвіч, Ул., 1985.

3187. **На вячэрні ў Вялікую пятніцу.**
[Кліўлэнд, 1985. 21 с.].
Словы й ноты. Апрацаваў К. Калоша.

3188. **Народниї письні з Подляшшя в записах Івана Ігнатюка.**
Частки III, IV, V: 1985.
Асноўная пазыцыя: *гл.* Народниї..., 1983; *гл. таксама:* Народниї..., 1984, 1987.

3189. **Новы Запавет і Псальмы.**
Таронта, Канада, Глабальнае Місіянэрскае Радыёслужэньне, 1985.
На адвароце тытула: New Testament and Psalms in Belorussian.
Перавыд. перакладу А. Луцкевіча з 1948.
Наступнае перавыд. (з перавыд. 1985): United Bible Societies, 1991. 353 с., 93 псальмы.
*Гл. таксама:* Новы Запавет..., 1931, 1948, 1991.

3190. **Песьняры Случчыны:** Збор вершаў.
[South River, N.J.], 1985. 233 с. 20 асобнікаў.
Перавыд. з: Слуцак, 1943. Перавыдаў Палікарп Манькоў.

3191. **Пратакол Другога Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску дня 27 чэрвеня 1944 году.**
[Grand Rapids], U.S.A., друкаваў Мікола Прускі, 1985. 48 с.

Выдаецца прыватна ў 36 нумараваных асобніках з арыгіналу, перапісанага на машынцы ў Менску адразу пасьля II Усебеларускага Кангрэсу ў 1944 г.
На вокладцы – каляровы сьцяг, на тытуле – "Пагоня".
У архіве БІНІМу знаходзіцца копія вэрсіі, зь якой друкавалася гэтая кніжка. У папцы – некалькі дакумэнтаў зь дзейнасьці БЦР у Бэрліне.

3192. **Пятроўскі, Ян.**
Клясычны Грэцка-Беларускі слоўнік.
Частка другая: літары N–Ω. Нанава апрацаваны.
[Gainesville, Fla], 1985. 282 с.
Частка 1: 1983.

3193. **Пятроўскі, Ян.**
На васьмідзясятыя ўгодкі (фрагмэнты).
Gainesville, Florida, 1985. 16 с.
Published by The Byelorussian Charitable Educational Fund, Inc.
Скарочаны варыянт: "Беларус", люты 1985.

3194. **Рапэцкі, Юры.**
Новае жыцьцё ў Хрысьце.
Варшава, 1985.
Кніга набіралася ў Канадзе. Выйшла з друку ў 1986 г. (інфармацыя: ліст Ю. Рапэцкага 11.05.1995).

3195. **Сказ пра Лысую Гару. Роздум ля парадная брамы.**
Ананімныя самавыдавецкія паэмы з анатацыямі Ант. Адамовіча.
Нью Ёрк, выдавецтва газэты "Беларус", 1985. 28 с.
С. 28: выданьні газэты, бібліяграфія.
*Гл. таксама:* "Беларус", №328, 1986.

3196. **Службы Нядзельныя.**
Лёндан, выданьне Беларускай Каталіцкай Місіі Бізантыйскага Абраду ў Ангельшчыне, 1985(?). 17 с.
Апрацаваў а. А. Надсон.

3197. **Станкевіч, В.**
З Ашмяншчыны да Амэрыкі – шлях змаганьня Янкі Станкевіча за мову й волю свайго народу.
Grand Rapids, Mich., "Беларускі Сьвет", №46, 1985. 10 с.
Прыблізны сьпіс працаў др. Янкі Станкевіча, 5 с.

3198. **Спытак выбраных твораў беларускіх паэтаў прысьвячаецца 65 угодкам Слуцкага Паўстаньня на Беларусі, 27 лістапада 1920 году.**
Брадфорд, Англія, выдавецтва "Гурток Васількі", 1985. 27 с.
Апрацаваў Янка Калбаса.

3199. **Сяднёў, Масей.**
Ачышчэньне агнём: Вершы.
Глен Коў–Нью Ёрк, 1985. 219 с.
Тытул таксама ў ангельскай мове. Вокладка Ірэны Рагалевіч-Дутко. Партрэт аўтара.

3200. **Сяднёў, Масей.**
Раман Корзюк: Раман.
Нью Ёрк–Мюнхэн, 1985. 314 с.
Тытул таксама ў ангельскай мове. Вокладка Ірэны Рагалевіч-Дутко. Партрэт аўтара.
*Гл. таксама:* "Беларус", №328, 1986.

3201. **Тарасэвіч, Ул.,** Біскуп, Апостальскі Візытатар для Беларусаў.
[Мітрафорнаму Протаерэю А. Надсану... Назначаю Вас маім Вікарыем].
Чыкага, 30 лістапада 1985. 2 с., суправаджальны ліст.
Біскуп У. Тарасэвіч ня можа выконваць сваіх абавязкаў з прычыны хваробы.

3202. **Шукелойць, Антон.**
Доля абраза Менскай Божай Маці.
New York, БАЗА, 1985. 3 с. ~50 асобнікаў.
Каляровая выява абраза.
Пачаткова тэкст гучаў як гутарка ў праграме радыё "Свабода". Выд. рассылалася ў часапісы, цэрквы, спэцыялістам.

3203. **Adamowitsch, A.**
Stätten des Schweigens.
Köln, Pahl – Rugenstein Verlag, 1985.
*Гл. таксама:* Adamowitsch..., 1974.

3204. **Akulich, Elena.**
Psychological Byelorussian War Novel. Case study: Vasil Bykau. Annotated selective bibliography.
New York, Queens College, Grad. School of Library and Information Studies, 1985. 61 p. 12 асобнікаў.
Дысэртацыя, абароненая на бібліятэчным факультэце Гарадзкога Ўнівэрсытэту Нью Ёрку.

3205. **Amnesty International et al.**
Is Kukobaka Free?
London, 1985. 1×0,5 m: чорна-белае.
Плякат. Партрэт М. Кукабакі й ягоны жыцьцярыс.

3206. The **Anglo-Byelorussian Society.**
Lecture courses on Byelorussian culture. Academic year 1985–86.
London, 1985. 1 p.

3207. **Baranava, M. P.**
Kurze Geschichte der Beloruss. Soz. Sowjetrepublik.
Jena, Friedrich Schiller Universität, 1985. 150 p. (Veröffentlichung der Friedrich Schiller Universität, Jena.)
Нямецкі пераклад. Гісторыя Беларусі ў савецкім асьвятленьні.

3208. **Bielarus.**
Chicago, The Bielarusian Coordinating Committee of Chicago, 9.28.1985. 3 p.
Інфармацыйная ўлётка пра Беларусь і беларусаў.

3209. **Bielarusian Coordinating Committee of Chicago, Illinois.**
For immediate release.
Chicago, March 15, 1985. 2 p.
Прэс-рэліз. Значаньне Акту 25 Сакавіка 1918 г.

3210. **Bielarusian Coordinating Committee of Chicago, Illinois.**
Зварот-просьба да нашых суродзічаў.
Chicago, сакавік 1985. 1 с.
Просьба аб фінансавай дапамозе. У беларускай і ангельскай мовах.

3211. **Byelorussian American Association, Inc.**
New York, Natl. Headquarters, 1985. 1 p.
Кароткая гісторыя арганізацыі; падаецца для прэсы.

3212. **Byelorussian Institute of Arts and Sciences, Inc.**
Publications of the Byelorussian Institute of Arts and Sciences and books available through the Institute.
New York, 1985. 4 p.
Сьпісы кніг, якія рассылаліся ў амэрыканскія бібліятэкі й якія можна было набываць празь БІНІМ.
*Гл. таксама:* Byelorussian Institute..., 1978, 1979, 1982, 1983.

3213. **Bykau, W.**
Romane und Novellen.
Köln, Pahl–Rugenstein Verlag, 1985. Bd. 1–2.

3214. An **evening with Byelorussian Writers.**
An On-Going series.
Professor Thomas E. Bird, Coordinator.
Flushing, New York, Queens College, CUNY, November 1985. 4 p.
Сьпіс беларускіх пісьменьнікаў, якія выступалі ў Queens College, раздаваўся на 3-м Сусьветным Кангрэсе Вывучэньня СССР і Ўсходняй Эўропы.
*Гл. таксама:* An Evening..., 1984; “Беларус”, №327, 1985.

3215. **Dr. Francišak Skaryna. On the 500th Anniversary of his birth.**
Chicago, prepared by the Bielarusian Coordinating Committee of

Chicago, Sept. 28, 1985. 1 p.
Прэс-рэліз.

3216. **Gerber, Stanford Neil.**
Russkoye Selo: The ethnography of a Russian-American community.
New York, AMS Press, 1985. 131 p.
Апісаньне "славяна-рускага" селішча ў ЗША.
*Гл. таксама:* Kipel, V., Belarusans..., 1999, p. 47–48.

3217. **Gitlin, M. N.**
Introducing John P. Stankievich.
Philadelphia, Pa., October 1, 1985. 2 p.
Перадрук з: "Беларускі Сьвет", №17(46), 1985.
Варыянты выд. розных фарматаў.
*Гл. таксама:* Gitlin..., 1958.

3218. **Hajeŭski, Anton.**
Narysy pa historyi Bielarusi.
München, 1985. 247 s.
Збор скрыптаў радыё "Свабода".
Машынапіс-арыгінал перахоўваецца ў БІНІМе. Друкавалася на пачатку 1980-х гг.; 5–10 асобнікаў.

3219. **Kipel, Vitaut.**
Byelorussia under Russian occupation.
Cleveland, Ohio, 1985. 23 p.
Перадрук з: Russian Empire. Some Aspects of tsarist and Soviet colonial practices. Cleveland, Ohio, Institut for Soviet and East European Studies, John Carroll University, 1985, p. 55–78.
*Рэц.:* "Canadian Slavonic Papers", March 1987, vol. 29, no. 1, p. 89–90.

3220. **Kipel, Zora.**
Christmas Traditions of Byelorussia.
New York, BAZA, 1985. 1 p.
Падборка беларускіх калядных звычаяў і песьняў. У ангельскай мове.
Улётка размнажалася вялікімі накладамі ў калядныя сэзоны.

3221. **Kipel, Zora.**
Вясельле (Wedding in Byelorussia).
New York, BAZA, 1985. 4 c.
Інсцэнізацыя беларускага вясельля. У ангельскай і беларускай мовах.

3222. **Kukobaka, Mikhail.**
Byelorussian worker imprisoned.
London, Amnesty International, October 1985. 4 p.
Абноўленая вэрсія: М. Кукабака зноў арыштаваны.

3223. **Observing the 67th Anniversary of the Proclamation of Byelorussian Independence.**
Program...
Cleveland, March 24, 1985. 4 p.
Укладка: ангельскі пераклад 3-е Ўстаўное Граматы БНР.

3224. **Skaryna's Anniversary Year, 1485–1985.**
New York, Byelorussian-American Assn., 1985. 4 p. 4 000 асобнікаў.
Выд. у гонар 500-х угодкаў Ф. Скарыны.
Партрэт Ф. Скарыны. Этнаграфічная карта Беларусі; у ангельскай мове.

3225. **South River Cultural and Heritage Commission.**
A walking / driving tour of South River houses of worship.
South River, N.J., May 4, 1985. 6 p.
У гэтае турыстычнае апісаньне ўлучаная й Царква сьв. Эўфрасіньні Полацкае.

3226. **Zelenko, Constantine.**
Tne Origins and Legacy of Yalta (An East European View).
London, European Liaison Group, 1985. 18 p.
Пачаткі й наступствы Ялцінскае канфэрэнцыі. Дэтальная інфармацыя пра E[uropean] L[iaison] G[roup].
Ад беларусаў у падрыхтоўцы выд. браў удзел Павел Асіповіч.

3227. **Zyznieuski, Walter** and **George.**
Illinois Hiking and Backpacking Trails.
Carbondale and Edwardsville, Southern Illinois University Press, 1985. 315 p.
Аўтары – беларускага паходжаньня, актыўныя ў беларускай уніяцкай царкве ў Чыкага. Кніга прысьвечаная бацькам аўтараў – Ганне й Нікодыму Жызьнеўскім.
*Гл. таксама:* "Беларус", №360, 1989; Zyznieuski, 1993.

3228. **Žyviza, Juri.**
Licht im Nebel = Сьвеціць у Тумане: Roman aus dem Leben des Weissruthenischen Volkes 1939–1949.
Leimen, Institut Bielarusaviedy, 1985. 180 p.
Раман з жыцьця Заходняе Беларусі ў 1939–1941 гг.

## 1986

3229. **Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА).**
[Byelorussians in US].
New York, BAZA, July 1986. 5 c.
Інфармацыя пра Беларусь, беларусаў у ЗША і танцавальную

групу "Васілёк", якая выступала ў праграме сьвяткаваньня 100-годзьдзя Статуі Свабоды, зарганізаванай Фэдэральным Міністэрствам US Dept. of Interior. У ангельскай мове.
*Гл. таксама:* "Беларус", №320, 1984; №327, 1985; №№328, 329, 1986.
У справаздачы пра выступы "Васілька" ("Беларус", №329, 1986) апублікаваны таксама верш Эмы Лазарус, прысьвечаны Статуі Свабоды ў беларускім перакладзе з ангельскае Н. Арсеньневай.

3230. **Беларускае Мастацка-Культурнае й Навуковае Таварыства ў Саўт Рывэры, Н.Дж.**
Каталёг [13-й выставы].
Саўт Рывэр, Н.Дж., 1986. 4 с.

3231. **Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква.**
Byelorussian Autocephalic Orthodox Church.
Брадфорд, Англія, выданьне Рады БАПЦ у Вялікай Брытаніі, 1986. 20 с.
Апрацаваў Я. Калбаса.

3232. **Беларускі Каляндар.**
(Byelorussian Calendar.)
South River, N.J., Byelorussian Press, 1986.
Насьценны, памесячны.

3233. **Беларусь: гістарычныя нарысы.**
Р. Астроўскі, Ю. Жывіца.
Ляймэн, Інстытут Беларусаведы, 1986. 22+13 с., карта.

3234. **Беларусь і яе кнігі = Belorussia and its Books.**
[Clayton, Victoria, Department of Slavic Languages, Monash University, Australia], 1986. 60 с.
Каталёг выстаўкі; тлумачэньні ў ангельскай мове. Артыкул пра Беларусь ды беларускі друк.

3235. **Белямук, Міхась.**
Вытокі беларускіх пячаткаў = Origins of Byelorussian Seals.
Клыўленд, Огаё, 1986. 47 с.

3236. **Белямук, Міхась.**
Яго Міласьці сп. С. Хмару.
Cleveland, 29 студзеня 1986. 4 с.
Палеміка з С. Сіняком (Хмарам).

3237. **Бембель, Алег.**
Што мы думаем пра цябе, беларуская мова?
Ляймэн, Інстытут Беларусаведы, 1986. 157 с.
С. 1: Друкуецца бяз ведама і згоды аўтара.

3238. **Да паважаных суродзічаў і прыяцеляў.**
Гэйнсвільл, Флярыда, 1986. 3 с.
Аўтар Ян Пятроўскі – пра 50-ы юбілей свайго жанімства. Аналіз пройдзенага шляху – “споведзь”.

3239. **Дапамога Беларусам Беласточчыны ў будове цэркваў і Беларускага Этнаграфічнага Музэю.**
“Дарагія Суродзічы! Заклік...”.
Нью Брансвік, Нью Джэрзы, ліпень 1986. 1 с.
*Подпісы* (ініцыятыўная група): Пётра Кажура, Юрка Азарка, Лёва Стагановіч.

3240. **Згуртаваньне Беларусаў Канады = Belorussian Canadian Alliance.**
Toronto, 1986. 1 с.
Інструкцыя, як зазначыць сваё беларускае паходжаньне ў часе перапісу 1986 г. У беларускай мове.

3241. **Змагар, Алесь = Zmagar, Ales.**
Случчына ў вагні: Раман у 4-х квадрах = Sluchchyna in Fire: A novel.
Флёрыда, З.Ш.А., выдавецтва Беларускага Вызвольнага Руху.
• Частка (квадра) 1. Край дзіваў, сьпеваў і красы: 1st Part. St. Petersburg, Florida, Published by Byelorussian Liberation Movement, 1986. 366 с.
• Частка (квадра) 2. Незалежнасьць = Independence. 2-nd part of Sluchchyna in Fire. Florida, U.S.A., published by Byelorussian Liberation Movement, 1988. 398 с.
• Частка (квадра) 3. Да зброі = With Arm. Part III. Gulfront, Florida, published by Byelorussian Liberation Movement, 1988. 338 с.
• Частка (квадра) 4. Пад сьцягам Пагоні. 346 с. Назову ў ангельскай мове няма.

3242. **Каардынацыйны Камітэт Беларусаў Канады.**
У справе перапісу насельніцтва Канады. Цэнзус 1986.
Торонто, 1986. 2 с.
Інструкцыя, як вызначыць беларускае паходжаньне ў часе перапісу 1986 г. Выд. Згуртаваньня Беларусаў Канады. У ангельскай мове.
*Гл. таксама:* Згуртаваньне Беларусаў Канады..., 1986.

3243. **Калубовіч, Аўген.**
На крыжовай дарозе: Успаміны = On the way of the Cross: Memoirs.
Клыўленд, выдадзена коштам аўтара, 1986. 252 с.
Уступ Dr. Roger Horoshko; у ангельскай мове.
Карты канцлягераў, якія апісваюцца ў тэксьце. Партрэт аўтара. Сьпіс кніг аўтара. Паказьнік прозьвішчаў.

Перавыд.: Менск, 1994.
*Гл. таксама:* "Беларус", №345, 1988.

3244. **Камітэт абароны Вязьняў Сумленьня.**
Mikhail Kukobaka.
New York, 1986. 1 с.
Храналёгія арыштаў М. Кукабакі ў 1970–1986 гг. У ангельскай мове.

3245. **Новая кружэлка Данчыка.**
[New York, Manhasset], 1986. 2 с.
Улётка. Здымак беларускага спевака Данчыка; інфармацыя пра кружэлку. У беларускай і ангельскай мовах.

**Носовичъ, И. И.**
*Гл.* Носовичъ, 1984.

3246. **Плескач, Васіль.**
Др. Аляксандар Орса.
Grand, Rapids, Mich., "Беларускі Сьвет" №47, 1986. 7 с.

3247. **Подляський, Казімеж.**
Литовці, Білоруси, Українці наші вороги – чи брати?
München, "Віднова", 1986. 157 с. (Бібліотека "Віднови"; №1.)
Украінскі пераклад (Віктор Поліщук) з: Białorusini – Litwini – Ukraińcy: Nasi wrogowie – czy bracia?".
Тэарэтычныя разважаньні з польскага гледзішча.

3248. **Пратакол 18-й чарговай Сэсіі Рады БНР, якая адбылася 30 жніўня 1986 г. у Беларускім селішчы "Полацак"...**
Кліўленд, 30 жніўня 1986. 4 с.
*Подпісы:* А. Шукелойц, В. Русак – сакратары.

3249. **Пятроўскі, Ян.**
Клясычны Грэцка-Беларускі слоўнік. Нанава апрацаваны.
Асобнікі, сшытыя ў адзін том, 1986.
Частка першая: літары A–M. USA, 1983. 290 с.
Частка другая: літары N–Ω, 1985.
*Гл. таксама:* Пятроўскі, 1983, 1985.

3250. **Пятроўскі, Ян.**
Слова да ўсіх, каму справа Беларускае Культуры ляжыць на сэрцы.
Gainesville, Published by Byelorussian Charitable Educational Fund, Inc., 1986. 8 с.
Развагі й заклік да беларускае грамады, каб падтрымлівалі беларускі друк. Фінансавыя зьвесткі пра Byelorussian Charitable Educational Fund, заснаваны Янам і Аліцыяй Пятроўскімі.

**Рада БНР.**
*Гл.* Пратакол..., 1986.

3251. **Ролсон, Янка.**
Кліч: [Зборнік паэзіі].
Адэляйда, Аўстралія, 1986. 109 с.
На 3 с. вокл.: Кніга перавыдана і дабаўлена 21/7/1986. Я. Ролсон.
Выглядае, што гэты асобнік – перавыд. з 1982.
Ліст Ролсана ад 15.08.1986.

3252. **Саковіч, Аляксандра.**
У пошуках праўды: Апавяданьні й аповесьці.
Нью Ёрк–Клыўлэнд, БІНІМ, 1986. 245 с. (Беларускія Пісьменьнікі і Паэты; №3.)
*Рэц.:* "Беларус", №339, верасень 1987.

3253. **Хмара, С.**
Аб Багох Крывіцкіх сказы = Legends of Kryvichian Gods: Byelorussian Mythology, 2nd ed.
Таронта, Літаратурная Сустань "Баявая Ўскалось", 1986. 31 с.
*Гл. таксама:* Хмара, 1946, 1948; Chmara, 1945, 1947.

3254. **Amnesty International Campaign. Belsize Park Group.**
Mikhail Kukobaka, Byelorussian worker.
London, October 1986. 4 p.

3255. The **Anglo-Byelorussian Society (Founded 1954).**
Lecture course on Byelorussian Culture; Academic Year 1985–86.
London, 1986. 1 p.
Праграма 20-га штогадовага сэмінару беларускае культуры. Расклад лекцыяў з 14 лістапада 1985 г. да 12 чэрвеня 1986 г.

**Belorusia and its Books...**
*Гл.* Беларусь і яе кнігі, 1986.

3256. **Byelorussian Liberation Front.**
Reports to the XIX World Anticommunist League Conference.
Luxembourg, September 7–10, 1986. 5 p.
Ёсьць таксама рэзалюцыя, якая тычыцца Беларусі і артыкул "Беларускія прадстаўнікі на Сусьветным Міжнародным Форуме ў Люксэмбургу 6–10.IX.1986".

3257. **Byelorussische Befreiungsfront Bericht, Reaktorkatastrophe in Tschernobyl – Tragödie = Atomic disaster in Chernobyl – tragedy for Byelorussia.**
Luxembourg, September 7–10, 1986. 3 p.
Дакумэнт для прэсы.

3258. An **evening with Byelorussian writers: an on-going lecture series.**
Flushing, N.Y., Queens College, CUNY, November 1986. 4 p.
Сустрэча зь пісьменьнікам Віктарам Казько. Кароткая інфарма-

цыя пра пісьменьніка.
*Гл. таксама:* An evening..., 1984, 1985.

3259. **Keneally, Thomas.**
A Family Madness.
Sydney–London–New York, Simon and Schuster, 1986. 336 p.
Гісторыя беларускае сям'і, якая па II сусьветнай вайне апынулася ў Аўстраліі.
*Рэц.:* "NYT Book Review", March 16, 1986, p. 9; "Беларус", №330, 1986 (пералічваюцца інш. рэц.).

3260. **New Jersey Ethnic Life, Series no. 10.**
Looking Back: Eleven Life Stories.
Compiled by Giles R. Wright; photographs by Donald P. Lokuta.
Trenton, N.J. Historical Commission, Department of State, 1986. 86 p.
Адбітак: p. 34–40: матар'ял прысьвечаны беларускай мастачцы Тамары Стагановіч-Кольба.
*Гл. таксама:* "Беларус", №333, 1987.

3261. **Ostrouski, R.,** Prof.
Bjelorussland im X bis XVI Jahrhundert.
Leimen, Institut der Bjelorussischen Kulturwissenschaften, 1986.
37 p. (Übersetzung aus bjelorussischen Sprache von Ferdinand Neureiter.)
Фрагмэнтарны пераклад кнігі.

3262. **Reaching the Slavic World for Christ.**
Pickering, Ont., Canada – Springfield, Ohio, Global Missionary Radio Ministries, 1986. 6 p.
Пастар Юры Рэпэцкі. Інфармацыя пра Беларусь.

3263. **Reaktorkatastrophe in Tschernobyl – Tragödie für Belorussland.**
[Stuttgart], Byelorussian Liberation Front, 1986. 2 S.
Агляд падзеяў у Чарнобылі ў першыя месяцы пасьля катастрофы.

3264. The **Seventeenth (17$^{th}$) Biennial Convention of Byelorussians of North America August 30–31 – September 1, 1986.**
Community Center "Polacak".
Cleveland–Strongsville, Ohio, 1986. 2 p.
Праграма 17-й Сустрэчы Беларусаў Паўночнай Амэрыкі.

3265. The **Sixty Eighth (68$^{th}$) Anniversary of the Declaration of Independence of Bielarus, March 25, 1918–1968.**
Program.
Chicago, 1986. 4 p.
Публікацыя III Устаўное Граматы БНР.

3266. **Tarasewicz, Leon.**
[Каталёг].

Sweden, Stockholm, 1986. [Бп.].
Кароткая біяграфія мастака. У ангельскай мове.

3267. **Urban, Michael E.**
The structure of elite circulation in the Belorussian Republic: centralization, regionalism and patronage.
New Orleans, La, November 20–23, 1986. 30 p.
Даклад, раздаваўся ўдзельнікам канфэрэнцыі "Eighteenth National Convention of the American Association for the Advancement of Slavic Studies".
Аналіз фармаваньня й ратацыі камуністычнай эліты ў БССР.

## 1987

3268. **БАПЦ (Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква).**
Торонто, красавік 1987. 1 с.
Адозва аб заснаваньні пры парафіі Сьв. Кірылы Тураўскага ў Таронта Фонду Дапамогі Беларускім эмігрантам.
*Подпіс:* Алесь Шаршуновіч.

3269. **Беларускае Мастацка-Культурнае й Навуковае Таварыства ў Саўт Рывэры, Н.Дж.**
Каталёг [14-е гадавое выставы].
Саўт Рывэр, Н.Дж., 1987. 4 с.

3270. **Беларускі Вызвольны Фронт, Мэльбурн, Аўстралія.**
Справаздача дэлегацыі Беларускага Вызвольнага Фронту з 20-й Канфэрэнцыі Сусьветнай Антыкамуністычнай Лігі ў Тайпэй, Тайван.
Мэльбурн, 25.8.1987. 5 с.
Палітычныя дамаганьні беларусаў – адраджэньне беларускай дзяржавы.
*Подпіс:* Палкоўнік У. Шнэк.

3271. **Беларускі Вызвольны Фронт, Эўропа.**
Беларускі ўдзел у эўрапейскай канфэрэнцыі.
Мюнхэн, 27–28 чэрвеня 1987.
Штуттгарт, чэрвень 1987. 5 с.
Даклад пра палітычны стан БССР: каляніяльны рэжым, русіфікацыя.
*Подпіс:* С. Каліновіч.

3272. **Данчык – Багдан Андрусышын: Беларуска-Амэрыканскі сьпявак.**
Grand Rapids, Mich., "Беларускі Сьвет", №48, 1987. 1 с.

3273. **Жывіца, Юры.**
Дадатак-дапаўненьне да кнігі "Недапетая песьня". Сабраў і апра-

цаваў Юры Жывіца. [Спадчына Хведара Ільляшэвіча].
Ляймэн, выдавецтва Інстытута Беларусаведы, 1987. 42 с.
Асноўны тэкст: *гл.* Жывіца, Недапетая песьня, 1981, 1982.

3274. [**К., Якуб,** укладальнік].
Вечная несьмяротная слава змагаром за Беларусь: Др. Вітаўт Тумаш.
Трэнтон, выдавецтва "Родны Край", 1987. 36 с.
Зборнік успамінаў-разважаньняў, прысьвечаны В. Тумашу. Падобныя зборнікі крыху іншага зьместу былі прысьвечаныя таксама а. С. Каўшу ды інш. асобам. Наклад такіх друкаў быў 1–3 асобнікі.

3275. **Клёнов, Андрей.**
Утренний голос: Роман в монологах.
Нью Йорк, "Парус", 1987. 314 с.
Здымак аўтара з Аннай Ахматавай.
Аўтар – габрай з паходжаньня, народжаны ў Беларусі, доўгі час быў дзейны як пісьменьнік на радзіме. Прыехаўшы ў ЗША, выдаў шмат кніг у расейскай мове, у шмат якіх кнігах ды паасобных публікацыях успамінае Беларусь. Шмат друкаваўся ў беларускіх пэрыёдыках як на Беларусі, гэтак і ў ЗША, супрацоўнічаў зь беларускай сэкцыяй радыё "Свабода".

3276. **Ліст сьвятара Уладзіслава Чарняўскага, пробашча каталіцкай парафіі ў Вішневе Валожынскага раёну Мінскай вобласьці, да ўдзельнікаў Агульнапольскага сэмінара каталіцкага духавенства ў Лодзі ў 1987 годзе.**
[Лёндан], 1987. 4 с. Машынапісная вэрсія.
Ліст распаўсюджваўся сярод беларускай эміграцыі.
Праблема служэньня ў касьцёле на беларускай мове.
*Гл. таксама:* Чарняўскі, 1988; "Беларус", №347, 1988.

3277. **Лісты да Гарбачова.**
Лёндан, 1987. 18 с.
Ліст-пэтыцыя да М. Гарбачова ад 28-х дзеячаў культуры БССР у справе русіфікацыі й ратаваньня беларускага народу ад дэнацыяналізацыі. Ліст датаваны: 15 сьнежня 1986 г.
*Гл. таксама:* "Беларус", №335, 336, 1987.

3278. **Лісты да Гарбачова.**
Лёндан, ЗБВБ, 1987. 39 с. Выд. 2, з ангельскім перакладам.
